

«ЗВЯЗДА» РАЗДАЕ ПРЫЗЫ... 3

ТУРЫЗМ У ЛІЧБАХ, ПАДЗЕЯХ І АСОБАХ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛІПЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 137 (28753)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Ці варта скарачаць дэкрэтны водпуск у Беларусі? Гэтая тэма перыядычна гучыць у грамадстве. Калі мы гаворым пра больш кароткі водпуск, значыць, мы павінны прапанаваць разгалінаваную, зручную сетку ясельных груп, павінны развіваць прыватныя дзіцячыя садкі. У многіх краінах дэкрэтны водпуск значна меншы, чым у Беларусі, таму размовы пра яго скарачэнне зразумелыя. У нас даецца тры гады — гэта забяспечаная магчымасць. Хай застанецца гэты водпуск».*

## ВЫТОКІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ



Ці трэба яшчэ раз нагадваць пра нашу нацыянальную ўнікальнасць і непаўторнасць? У першую чаргу яна — унікальнасць, тоіцца ў самой прыродзе — у прыгожых, чыстых крыніцах, рэках і азёрах, у таямнічых лясах і ўзвышшах. З генетычнай памяці беларусаў не сцерліся адвечныя сімвалы, не забываюцца народныя традыцыі і святы, самабытныя рамёствы. Цяпер у кожным раёне кожнай вобласці ўзята пад увагу кожная крынічка — як сапраўдная святыня, як дзівосны цуд. Пры аддзелах культуры райвыканкамаў створаныя дамы рамёстваў, якія не толькі адкрываюць, адшукваюць, але і адраджаюць паўзабытыя, а то і зусім забытыя рамёствы, якімі карысталіся нашыя продкі, унікальныя мясцовыя строі.

Вытокі малой радзімы — вядомыя і зразумелыя кожнаму беларусу словы — цяпер будуць атаясамлівацца з адмысловай рубрыкай «Звязды», пад якой мяркуем змяшчаць здымкі пра хараство і гармонію прыроды і чалавека. У гэтай рубрыцы мы будзем расказваць пра цікавыя куточкі прыроды, паказваць майстроў і іх рукатворныя работы, якія складаюць нашу гістарычную і культурную спадчыну.

Сёння мы публікуем першы здымак новай рубрыкі, зроблены ў Навагрудскім раёне. Каля маляўнічай крыніцы ў ваколіцах вёскі Мотча — жыхарка старажытнага горада, майстар народных промыслаў раённага цэнтра рамёстваў Кацярына СІНЕВІЧ у аднаўленым навагрудскім жаночым строі канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Пашыла строй і вышыла карункі на сарочцы і фартуху ў 2015 годзе майстрыха Любоў Завольская.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

Міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс Рынкевічс па выніках перагавораў з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем у Рызе паведаміў журналістам аб падрыхтоўцы візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

**Беларускія хірургі ўпершыню правялі двухбаковую кахлеарную імплантацыю ў дзіцяці з глухатой.**



Пасля рэканструкцыі памежнага перахода «Брузгі» там адновіцца пешаходны рух.

**Вядомы беларускі спецыяліст Андрэй Сідарэнка ўзначаліў нацыянальную зборную па хакеі. Ён ужо быў галоўным трэнерам зборнай у 1994—1996 гадах.**

Святкаванне Дня пажарнай службы ў Беларусі пройдзе на 112 пляцоўках.

■ «Звязда» даследуе праблему

## Рыбка становіцца сапраўды залатой

ЦІ АТРЫМАЕЦЦА Ў НАС ЗАХАВАЦЬ ЗАПАСЫ ПАДВОДНАЙ ФАЎНЫ?

**Каб не застацца без улову, беларускія рыбакі пачалі практыкаваць новы метад: прынёс — адпусціў — злавіў. Гэты анекдот ужо не першы год ходзіць сярод аматараў пасядзець на досвітку з вудай.**
**Падобны фальклор нараджаецца нездарма. У галовах абывацеляў трывала засела думка пра тое, што нашы рэкі і азёры, якія заўсёды славіліся багатымі запасамі рыбы, даволі-такі апусцелі. Ці праўда гэта?**
**Паспрабуем разабрацца.**

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

■ Прыёмная кампанія — 2018

# «ЯКАСЦЬ» АБІТУРЫЕНТАЎ РАСЦЕ

## 300 балаў для паступлення далёка не заўсёды хапае

У Беларускім дзяржаўным універсітэце падвялі першыя вынікі прыёмнай кампаніі. На дзённую бюджэтную форму навучання тут пададзена 3778 заяў абітурыентаў пры плане прыёму 2122 чалавекі. Сярэдні конкурс склаў 1,8 чалавека на месца.

Сярод тых, хто падаў дакументы, 93 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд (у 2017 годзе іх было 66) і чатыры лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Таксама сярод абітурыентаў БДУ 856 школьных медалістаў і выпускнікоў ССНУ з дыпломам з адзнакай (у 2017 годзе было 823) — гэта 22,6 % ад агульнай колькасці ахвотных вучыцца ва ўніверсітэце.

Выпускнікоў ліцэяў і гімназій сярод тых, хто падаў дакументы, — 1741, што складае 46 %. Узрасла колькасць абітурыентаў, якія маюць сумарны бал, больш за 300, — да 57 % ад агульнай колькасці (летась — 51,4 %). Сярод іх — 125 абітурыентаў, якія атрымалі на ЦТ стабальны вынік, а пяць абітурыентаў маюць два стабальныя сертыфікаты.

Конкурс на педагагічныя спецыяльнасці па дзённай бюджэтнай форме навучання склаў 1,3 чалавека на месца. Сярод гэтых абітурыентаў 77 пераможцаў абласных алімпіяд і медалістаў, а таксама чатыры выпускнікі педагагічных класаў.

На завочную бюджэтную форму навучання падалі дакументы 637 абітурыентаў пры плане прыёму 226.

Першае пасяджэнне прыёмнай камісіі па залічэнні на бюджэтную форму навучання адбудзецца 20 ліпеня. Усе пасяджэнні будуць транслявацца на інтэрнэт-сайце БДУ www.bsu.by.

Першыя вынікі падвёў таксама і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. На бюджэтную форму атрымання адукацыі сёлета была пададзена 1881 заява пры плане прыёму 1265.

Па-ранейшаму ў топ самых запатрабаваных уваходзяць IT-спецыяльнасці і спецыяльнасці эканамічнага профілю. Так, на спецыяльнасцях «эканоміка электроннага бізнесу», «электронны маркетынг», «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання», «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» прахадны бал склаў звыш 365.

Сярэдні бал абітурыентаў, якія падлягаюць залічэнню на бюджэт, у параўнанні з 2017 годам зноў вырас і склаў 338 (у 2017 годзе ён быў роўны 332).

23 чалавекі падалі дакументы ў БДУІР паза конкурсам, сярод іх — лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і 22 пераможцы алімпіяд рознага ўзроўню. Статыстыка з'яўляецца папярэдняй. Залічэнне на бюджэт пройдзе 26 ліпеня.

А вось на сайце Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ўжо можна азнаёміцца са спісам абітурыентаў, рэкамендаваных да залічэння на бюджэт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# Амаль шэсць чалавек на месца

## Якія спецыяльнасці карыстаюцца найбольшым попытам у Брэсцкім дзяржуніверсітэце імя А. С. Пушкіна

**У найстарэйшай ВНУ Брэсцкай вобласці працягваецца ўступная кампанія. І хоць дзень, выбраны журналістам для наведвання (18 ліпеня), стаў своеасаблівым днём зацішша, у адказнага сакратара прыёмнай камісіі Дзмітрыя ГРЫЦУКА работы шмат.**

— Самымі напружанымі былі першы і апошні дзень прыёму дакументаў на бюджэтную форму навучання, — гаворыць Дзмітрый Уладзіміравіч. — У першы дзень фае галоўнага корпуса ўяўляла сабой літаральна людское мора: абітурыенты, іх бацькі, сваякі... Відаць, вялікая частка прэтэндэнтаў на студэнцкі білет хацелі хутчэй закончыць этап хваляванняў, звязаны з выпускнымі экзаменамі, ЦТ, аддаць дакументы і чакаць вынікаў, праглядваючы інфармацыю ў інтэрнэце. Ну і апошні дзень традыцыйна поўны хваляванняў, калі абітурыенты яшчэ могуць перамясціць дакументы на іншы факультэт, а то і паспець з імі ў іншую навучальную ўстанову.

І вось ужо можна падводзіць некаторыя прамежкавыя вынікі, — адказны сакратар гартае электронныя старонкі дакументаў. — У цэлым конкурс на бюджэтную форму дзённага навучання па ўніверсітэце склаў 1,97 чалавека на месца, на завочнае — 2,03. Сёлета у нашу ВНУ падалі дакументы 33 медалісты і 26 выпускнікоў сярэдніх навучальных установаў, якія маюць дыпломы з адзнакай. З іх 23 чалавекі вырашылі скарыстаць сваю льготу і паступіць на педагагічныя спецыяльнасці без уступных іспытаў. Пачынаючы з мінулага года выпускнікі профільных класаў педагагічнага кірунку таксама могуць быць залічаныя без іспытаў па рэкамендацыі педсаветаў. І такія прыклады ў нас ёсць. Выказалі жаданне стаць настаўнікамі і пераможцы рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, такіх пяць чалавек.

Сёлета дастаткова высокі конкурс складўся на матэматычныя спецыяльнасці, каля двух чалавек на месца. А самай папулярнай у абітурыентаў стала спецыяльнасць «псіхалогія», прэтэндэнтаў было 5,8 чалавека на месца, па спецыяльнасці «турызм і гасціннасць» геаграфічнага факультэта — 4,8 чалавека.

У прыёмнай камісіі адзначаюць, што гэтым разам не назіралася ажыятажу мінулых гадоў на юрыдычную спецыяльнасць, а вось факультэт замежных моў па-ранейшаму папулярны ў моладзі.

Цяпер у прыёмнай камісіі адносна спакойны перыяд, але нельга яго назваць зацішшам. Уступныя іспыты па беларускай літаратуры, рускай літаратуры, фізічнай культуры пачыналіся з 19 ліпеня. А напярэдадні вечарам адбыўся сход з кансультацыяй для тых, хто будзе здаваць родную літаратуру (такіх 23 чалавекі) і рускую літаратуру — 21 чалавек. Ну і фізічную падрыхтоўку прэтэндэнтаў на дыплом настаўнікаў фізвыхавання можна праверыць толькі рэальнымі іспытамі на выкананне нарматываў. Затым будзе праведзена залічэнне на бюджэт. Пасля гэтага пачнецца актыўны рух тых, хто прыме рашэнне атрымліваць адукацыю на платнай аснове.

**Першы прарэктар універсітэта Сяргей МАРЗАН** адзначыў высокі ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў, якія паступаюць на факультэт фізвыхавання. З іх 16 — майстры спорту. Чацвёра паспелі стаць прызёрамі розных рэспубліканскіх чэмпіянатаў. Студэнтамі захацелі стаць пераможца чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы сярод юнакоў, а таксама бронзавы прызёр першынства свету па веласіпедным спорце.

— На філфак мы таксама чакаем творчых, зацікаўленых студэнтаў, — працягвае Сяргей Андрэевіч. — Наш філалагічны факультэт мае не адну навукова-педагагічную школу, тут шануюцца і працягваюцца традыцыі, што склаліся ў пару Уладзіміра Калесніка. Сёлета, праўда, на гістарычны факультэт падаў дакументы выпускнік з Пружан, які на ЦТ набраў 100 балаў па беларускай мове. Такім абітурыентам мы заўсёды рады.

З мамай абітурыента-стабальніка Аленай Зялевіч мне ўдалося пагаварыць па тэлефоне.

«Павел быў старанным і мэтанакіраваным вучнем. Па гісторыі ён рыхтаваўся самастойна, яму пашанцавала з педагогам у гімназіі Тамарай Ляўчук. А беларускую мову дапамагла рыхтавацца рэпетытар Алена Вакульчык, дарэчы ў яе гэта не першы стабальнік, — .расказала яна. — Брэсцкі гістфак сын выбраў пасля таго, як на навукова-практычных канферэнцыях ён пазнаёміўся з некаторымі выкладчыкамі факультэта, паслухаў іх даклады. Хоць з яго вынікамі тэсціравання можна было смела ехаць у сталічныя ВНУ, мы падтрымалі рашэнне сына».

У прыёмную камісію зазірнула і **рэктар універсітэта Ганна СЕНДЗЕР.** Карэспандэнт газеты скарыстала магчымасць і спытала Ганну Мікалаеўну, як яна ацэньвае сёлетнюю ўступную кампанію.

— Прыемна адзначыць, што сёлета павялічылася колькасць медалістаў, выпускнікоў профільных педагагічных класаў, тытулаваных спартсменаў, — адзначыла кіраўнік ВНУ. — І, што асабліва радуе, расце колькасць выпускнікоў, якія матываваныя атрымаць прафесію настаўніка. Гэта было бачна нават па першым дні прыёму. У першы дзень прыходзяць тыя, хто загадзя і свядома выбраў факультэт і спецыяльнасць. Варта сказаць, што 200 замежных абітурыентаў з 17 краін выказалі гатоўнасць стаць нашымі першакурснікамі. У цэлым набор на бюджэтную форму навучання прайшоў паспяхова. Дала свае вынікі вялікая прафарыентацыйная работа, якую праводзіць універсітэт.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Добрая справа

# Купіце сшыткі і алоўкі

## У Мінску стартавала акцыя «Партфель першакласніка»

**Гэта дабрачынная акцыя, ініцыятарам правядзення якой выступае камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама пры падтрымцы грамадскіх арганізацый, ужо стала традыцыйнай. Сёлета яна прадоўжыцца да 22 жніўня. Спосаб удзелу просты: трэба набыць школьныя прылады, прыдатныя для першакласнікаў, і аддаць іх валанцёрам, якія будуць працаваць на буйных гандлёвых аб'ектах.**

Як расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА,** мэта акцыі — дапамагчы сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў або ў якіх адзін ці абое бацькі з'яўляюцца інвалідамі, а таксама няпоўным, шматдзетным і малазабяспечаным сем'ям, дзе ёсць будучыя першакласнікі. Дакладна знайсці валанцёраў можна будзе ў ЦУМе, ГУМе, універмагах «Беларусь», «Кірмаш» і гандлёвым доме «На Нямізе», акрамя таго, зараз вядуцца перагаворы з прыватнымі гандлёвымі сеткамі. Працаваць актывісты будуць з 13 да 19 па буднях і з 12 да 16 па выхадных. Пасля завяршэння акцыі ўсе падарункі перададуць у гарадскую арганізацыю «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў», дзе і сфарміруюць паўнавартасныя партфелі для першакласнікаў. Таксама можна аказаць фінансавую дапамогу, пералічыўшы сродкі на разліковы рахунак арганізацыі з пазнакай «Партфель першакласніка». Летась дзякуючы акцыі поўны камплект прылад да школы атрымалі больш за 300 хлопчыкаў і дзяўчат. Свае падарункі змогуць забраць юныя мінчане 27 жніўня ў кінатэатры «Піянер». У гэты дзень там пройдзе свята «Дзень першакласніка» з забаўляльнай праграмай і мульцікамі.

— Цяпер у сталіцы 14 435 шматдзетных сем'яў, штогод іх колькасць працягвае расці. Да пачатку навучальнага года ўсім ім будзе аказана аднаразовая матэрыяльная дапамога для падрыхтоўкі дзяцей да школы ў памеры 30 % бюджэту пражытковага мінімуму на дзіця. У мінулым годзе такую падтрымку выдзеліў больш як 25 тысячам школьнікаў з шматдзетных сем'яў, — адзначыла Ірына Дудка.

Зараз у сталіцы актыўна ўжываюць і іншыя спосабы дапамогі бацькам. Так, сем'і, у якіх нарадзіліся трайняты, могуць разлічваць на 40 гадзін на тыдзень бязвыплатнай працы няні. Тыя, у каго з'явіліся двайняты, — на 20 гадзін у тыдзень. Такімі паслугамі цяпер карыстаюцца 19 і 587 сем'яў адпаведна. Акрамя таго, для падтрымкі мам у дэкрэце дзейнічаюць такія праекты, як «Бабуля на гадзіну» і «Хвілінка для мамы», каб у маладых жанчын з'явіўся час для сябе. Як сцвярджаюць эксперты, гэта становіца адбіваецца на клімаце ў сям'і. Не абмінаюць увагай і татаў. У сярэдзіне верасня стартуе навучальны праект «Таты Pro».

**Дар'я КАСКО**

■ Блізкая ўлада

# Не ўсе скаргі магчыма задаволіць

**Памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА выслухаў звароты гамяльчан падчас асабістага прыёму ў Гомельскім гарвыканкаме. Прыём доўжыўся больш за тры гадзіны.**



**Людзі прасілі дапамагчы з рашэннем зямельных і маёмасных спрэчак,налічэннем пенсій, вяртаннем грашовых укладаў часоў СССР...**

14 чалавек запісаліся да Юрыя Шулейкі. Большасць з іх даўно і добра вядомыя прадстаўнікам улады. Так, восем былі нязгодныя з рашэннямі судоў або нарматыўнымі дакументамі. Адказы, атрыманыя ў розных інстанцыях, іх не задавальняюць. Менавіта таму грамадзяне зноў і зноў прыходзяць на прыём.

Напрыклад, пенсіянер гаворыць, што ў адносінах да яго вынесена несправядлівае рашэнне суда па справе пра ДТЗ. Мужчына не лічыць сябе вінаватым, аднак рашэнне суда не на яго карысць. Ён павінен пералічваць частку пенсіі жанчыне, якую прызналі пацярпелай. Грамадзянін адзначыў, што пасля вылічэнняў у яго застаецца зусім невялікая сума грошай. Юрый Шулейка даручыў вывучыць магчымасць выдзялення чалавеку матэрыяльнай дапамогі праз органы сацыяльнай абароны.

Яшчэ адна заяўніца незадаволена тым, што суседзі зрабілі рамонт і перапланіроўку сваёй кватэры. Жанчына лічыць, што пасля гэтага сцяна, якая падзяляе жыллё, стала танчэйшая. Тры камісіі не знайшлі ніякіх парушэнняў, аднак пенсіянерку гэта не задаволіла і яна просіць «вярнуць усё як было».

Зразумела, будзе праведзена чарговая праверка па кожнай са скаргаў. Пры магчымасці людзям акажуць матэрыяльную дапамогу. Але ануляваць судовыя рашэнні — не ў кампетэнцыі інспектара па Гомельскай вобласці. Дарэчы, Юрый Шулейка адзначыў, што ў невялікіх раённых цэнтрах людзі часцей паднімаюць грамадска значныя праблемы:

— Сустрэча ў Гомелі была запланавана, і мы рыхтаваліся да гэтага прыёму. Мы разумелі, што многія грамадзяне шмат разоў ужо звярталіся ў розныя інстанцыі, у тым ліку ў суды, дайшоўшы аж да Вярхоўнага Суда. Многа пытанняў было са скаргамі на органы правапарадку: быццам бы не дасканала разгледжаны справы асобных грамадзян. Гэты прыём ліч нялёгкім. У той жа час мы скарысталіся магчымасцю растлумачыць грамадзянам, якія атакуюць органы ўлады, але па факце ўжо маюць дакладныя і вычарпальныя адказы ад усіх адпаведных структур, што рашэнні прыняты ў строгай адпаведнасці з заканадаўствам. Сваё даручэнні я імкнуся кантраляваць, каб разумець, наколькі я паўнавартасна працую на гомельскай зямлі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Падпіска-2018

# ГАЗЕТУ ПРОСТА ПРЫЕМНА ЧЫТАЦЬ

У вёсцы Даколь кладуць новы асфальт. Значыць, вёска жыве. Яна немалая. Хоць і тут, вядома, ёсць свае праблемы, найперш дэмаграфічныя. Аднак пра іх гаварыць сёння мы не будзем, бо прыехалі ў гэтыя маляўнічыя мясціны з выключна прыемнай місіяй — уручыць наш галоўны прыз па выніках падпіскі на 3 квартал і 2-е паўгоддзе. Узнагароду — 30-літровую дубовую бочку — зрабілі народныя майстры-ўмельцы з Любаншчыны, а пераможца падпісной кампаніі жыве ў суседнім Глускім раёне, што, праўда, ужо на Магілёўшчыне.

**Святлана Мікалаеўна ГЕРАСІМЧУК, загадчыца Калаціцкага дзіцячага садка, і яе муж Мікалай Іванавіч, ляснік мясцовага лясніцтва,** выпісваюць і чытаюць «Звязду» ўжо гадоў 10.

— Раней мы выпісвалі многа выданняў, я 15 гадоў выкладала ў нашай Дакольскай школе рускую мову і літаратуру, таму чытала многа. Праўда, «Звязды» ў гэтым спісе не было. Але аднойчы муж, вярнуўшыся з працы, сказаў, што «Звязда», газета на роднай мове, карыстаецца цікавасцю ў яго на рабоце, у лясніцтве. «Трэба выпісаць яе і дахаты», — сказаў ён. Вось з таго часу мы і сябруем з «роднай газетай на роднай мове».

— Пасля таго як памянела дзяцей у нашай школе, — працягвае Святлана Мікалаеўна, — яна закрылася, я стала працаваць у нашым дзіцячым садку, а калі закрыўся і ён — перайшла на працу ў такі ж садок у суседняй вёсцы. Падзей было шмат — «Звязда» заставалася.

Раней Святлана Мікалаеўна і Мікалай Іванавіч не прыяўлялі вялікай цікавасці да падпісной кампаніі — выпісвалі газету і ўсё. А сёлета вясной вырашылі паспрабаваць. Тым больш што да розыгрышу прапаноўваўся патрэбны ў гаспадарцы мотаблок.






**Добры ўраджай вырас на градках, якія Святлана ГЕРАСІМЧУК апрацоўвае з дапамогай набору садовых інструментаў — іх гаспадыня раней таксама выйграла ў латарэі падпісчыкаў «Звязды».**

Мотаблок выйграць не ўдалося — затое дастаўся набор сельгасінвентару (таксама нялішні, бо ёсць жа агарод).

— Муж сказаў: ну і добра: у цябе работа малярухомая, значыць, будзеш больш завіхацца ў градах, раз такая справа, — смяецца Святлана Мікалаеўна. — Так і атрымалася. У гэтую падпіску, — працягвае яна, — думаем: снарад двойчы ў адну варонку не трапляе. Але ж — дубовая бочка! Адправілі купон. А днямі патэлефанавалі з рэдакцыі — вось было здзіўленне...

Сапраўды, снарад, можа, і не падае два разы ў адно месца, але ўдача... Яна заўсёды побач з чалавекам. Проста трэба зрабіць ёй насустрач хоць бы маленькі крок. Вось як зрабілі гэта Герасімчукі.

Мікалай Іванавіч, які на кароткі момант далучыўся да нашай размовы, кажа, што ў газеце яго цікавяць найперш матэрыялы на міжнародную тэматыку: «Што ў свеце робіцца», напрыклад. «А наогул, — кажа ён, — газету проста прыемна чытаць».

Святлана Мікалаеўна з'яўляецца дэпутатам Калаціцкага сельскага Савета, і лагічна, што яна выдзяляе нашу ўкладку «Мясцовае самакіраванне», таксама — нашу пастаянную рубрыку «Крынічка», дзе «ёсць усё тое, што цікавіць чалавека на зямлі»...

Хай шчасціць ім, людзям на зямлі!

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

■ Ну і ну

## ЧАЛАВЕКА Ў ВЫШУКУ ЗАТРЫМАЛІ РАЗАМ З ЯБЛЫКАМІ

Кантрабандныя яблыкі трапляюць пад арышт на тэрыторыі Магілёўскай вобласці не першы раз. Здзіўляе, што гэтыя выпадкі паўтараюцца на зайздрасць рэгулярна. На гэты раз дзве фуры з 40 тонамі польскіх яблыкаў на «борце» былі затрыманы мытнікамі і супрацоўнікамі міліцыі ў Краснапольскім раёне. Таваразсуправаджальныя дакументы, якія прад'явілі кіроўцы, аказаліся несапраўднымі, удакладнілі ў Магілёўскай мытні. Нечаканым стала тое, што тавар суправаджаў грамадзянін Расійскай Федэрацыі, які... знаходзіцца ў міждзяржаўным вышуку. Ён дастаўлены ў Ленінскі райаддзел унутраных спраў Магілёва для далейшага разбору. Што датычыцца яблыкаў, агульны кошт якіх склаў больш за 60 тысяч рублёў, то цяпер іх уладальніку прыйдзецца заплаціць штраф у памеры 50 % ад іх кошту. Па фактах парушэння заканадаўства Магілёўская мытня распачала адміністрацыйныя працэсы ў адпаведнасці з часткай 4 артыкула 12.17 КаАП Рэспублікі Беларусь.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўракамісія запусціла санкцыйную працэдуру супраць Венгрыі праз законы па міграцыі

Еўракамісія (ЕК) вырашыла запусціць санкцыйную працэдуру супраць Венгрыі з-за прынятых Будапештам законаў па міграцыі. Пра гэта заявіла ў чацвер на прэс-канферэнцыі ў Брусэлі прадстаўнік ЕК Наташа Берта.

«Еўракамісія вырашыла сёння падаць у Суд ЕС на Венгрыю за парушэнне еўрапейскага заканадаўства», — сказала яна.

### Дзяржсдума Расіі адобрыла ў І чытанні праект аб змяненні пенсійнай сістэмы

Урадавы законапраект аб зменах пенсійнай сістэмы прайшоў першае чытанне ў Дзярждуме. За прыняцце дакумента прагаласавалі 327 дэпутатаў, супраць — 102.

Законапраектам аб змене пенсійнай сістэмы, у прыватнасці, прадугледжваецца паступовае павышэнне ўзросту выхаду на пенсію да 65 гадоў для мужчын (да 2028 года) і да 63 гадоў для жанчын (да 2034 года). Па словах міністра працы і сацыяльнай абароны Расіі Максіма Тапіліна, у выніку манеўру



«пенсіі будуць праіндэксаваныя тэмпамі, больш чым у два разы вышэйшымі за інфляцыю». Зараз пенсійны ўзрост для мужчын і жанчын у Расіі складае 60 і 55 гадоў адпаведна.

### CNN: ваенны парад у Вашынгтоне будзе каштаваць крыху менш за вучэнні ЗША і Паўднёвай Карэі

Ваенны парад, правядзенне якога даручыў арганізаваць у сталіцы ЗША ў лістападзе прэзідэнт Дональд Трамп, абыдзецца прыкладна ў $12 млн. Гэта крыху менш за выдаткі на адмененыя сумесныя вучэнні Злучаных Штатаў з Паўднёвай Карэяй, якія Трамп называў «неверагодна дарагімі», паведаміла тэлекампанія CNN са спасылкай на свае крыніцы ў міністэрстве абароны краіны.

Парад запланаваны ў Вашынгтоне на 10 лістапада напярэдадні Дня ветэранаў. Названая сума з'яўляецца толькі «планаванай лічбай» і можа ўзрасці па меры падрыхтоўкі, адзначыла адна з крыніц тэлекампаніі.

Згодна з планамі, парад пройдзе ад Белага дома да Капіталійскага ўзгорка, дзе размяшчаецца Кангрэс ЗША. Трамп, як чакаецца, будзе назіраць за тым, што адбываецца, з назіральнай пляцоўкі, якую мяркуюць збудаваць побач з будынкам Кангрэса.

Апошні раз ваенны парад праводзіўся ў сталіцы ЗША ў 1991 годзе ў гонар перамогі ў вайне ў Персідскім заліве. У ім узялі ўдзел каля васьмі тысяч вайскоўцаў, па вашынгтонскіх вуліцах праехала тэхніка, якая ўдзельнічала ў баявых дзеяннях, прайшлі прадстаўнікі розных родаў войскаў, музыканты з ваенных аркестраў, таксама была задзейнічана і авіяцыя. За імі назіралі каля 200 тысяч гледачоў.

Той парад абышоўся бюджэту прыкладна ў $12 млн, а ў пераліку на сённяшні дзень яго кошт склаў бы каля $22 млн.

■ Надвор'е

# Анамальна гарачы май і халодны люты

## Тэмпература паветра ў нашай краіне ў першым паўгоддзі перавысіла кліматычную норму на 0,9 градуса

**Пра гэта паведаміла начальнік сектара метадычнага забеспячэння гідраметэаралагічных прагнозаў службы метадычнага забеспячэння гідраметэаралагічных назіранняў, вывучэння клімату і фонду даных Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Наталля КЛЯВЕЦ.**

Тэмпература паветра за першае паўгоддзе склала ў сярэднім па краіне плюс 5,6 градуса. А больш за ўсё перагрэўся за гэты час май. Пяты месяц года аказаўся самым цёплым за ўсю гісторыю інструментальных назіранняў у нашай краіне. Дарэчы, у маі сярэдняя тэмпература паветра была на 3,5 градуса вышэйшая за кліматычную норму. А максімальная тэмпература была зарэгістравана на метэастанцыі Брэст 30 мая і склала плюс 31,3 градуса.

Спецыяліст Белгідрамета ўспамінае, чым здзіўляла надвор'е ў іншыя месяцы гэтага года. Самым халодным месяцам быў люты. Мінімальная тэмпература, зарэгістраваная гэтай зімой, назіралася ў Клічаве 27 лютага — мінус 30,4 градуса. Такога халоднага апошняга зімовага месяца не было ўжо 25 гадоў. Сакавік у гэтым годзе быў вельмі халодны, сярэдняя тэмпература склала мінус 2,6 градусаў. З 1981 года такі халодны сакавік бывае прыкладна адзін раз на пяць гадоў.

### Надвор'е як на Чарнаморскім узбярэжжы

У першым паўгоддзі на ўсёй тэрыторыі краіны адчуваўся недабор ападкаў. А потым... як сарвала ў штопар. «Цяпер у сярэднім па краіне выпала 223 міліметры, што складае 76 % ад кліматычнай нормы за год», — сказала Наталля Клявец.

Першая дэкада ліпеня была досыць халоднай і мокрай: у сярэднім выпала 172 % ад кліматычнай нормы ападкаў за месяц. Лішак увільгатнення адзначаўся практычна паўсюдна, за выключэннем паўднёвага ўсходу.

— У Брагіне, Гомелі выпала 46 % ад кліматычнай нормы ападкаў. 12 ліпеня ў Брэсце за 12 гадзін выпала 60 міліметраў ападкаў, 14 ліпеня ў Жыткавічах — 59 міліметраў. 17 ліпеня моцныя лівні і навальніцы прайшлі амаль па ўсёй краіне, але яны не былі небяспечнымі, — адзначае Наталля Клявец.

### На захадзе краіны дажджоў стане менш

Паведаміла Наталля Клявец і пра надвор'е на найбліжэйшыя дні. Дык вось, цёплае і дажджлівае надвор'е чакаецца ў нашай краіне да канца гэтага тыдня.

Прычынай дажджоў з'яўляецца маларухомы паўднёвы цыклон, цэнтр якога размясціўся над паўночным усходам Украіны. На тэрыторыю нашай краіны паступае цёплае і вільготнае паветра чарнаморскага паходжання. «Сёння ў нас надвор'е з праліўнымі дажджамі і высокай тэмпературай паветра, больш характэрнае для чарнаморскага ўзбярэжжа, — расказвае Наталля Клявец. — Да канца гэтага тыдня тэрыторыя краіны застанецца пад уплывам атмасферных франтоў і цёплых вільготных паветраных мас, таму захаваецца няўстойлівае, па-летняму цёплае надвор'е». У дзённыя і вячэрнія гадзіны ў многіх раёнах краіны будуць адзначацца дажджы рознай інтэнсіўнасці, навальніцы з парывістым ветрам. У начны час навальнічная актыўнасць і дажджы будуць слабець. Тэмпературны рэжым застанецца павышаны. Уначы будзе анамальна цёпла — плюс 14—19 градусаў, а днём — ад плюс 22 да плюс 28 градусаў.

У суботу ўдзень у асобных раёнах па ўсходзе краіны чакаюцца моцныя дажджы. У нядзелю ў цэнтральных і ва ўсходніх раёнах прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Толькі заходнія раёны апынуцца пад уплывам зоны павышанага ціску, там будзе ў асноўным без ападкаў.

У пачатку наступнага тыдня на захадзе краіны дажджоў стане менш. У той жа час у цэнтральных і ўсходніх рэгіёнах захаваецца няўстойлівае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі, магчымасць навальніц застанецца высокай. Тэмпература паветра амаль не зменіцца. Уначы яна будзе вагацца ад плюс 11 градусаў на захадзе да плюс 18 градусаў на ўсходзе, удзень — усё тыя ж 22—28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Рыбка становіцца сапраўды залатой


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### АТАКА НА ПАДВОДНАЕ ЦАРСТВА

Каб рэальная карціна ўяўлялася наглядна, акунёмся спачатку не ў ваду, а ў гісторыю. Статыстыку рыбнага промыслу ў нас пачалі весці толькі на мяжы пазамінулага і мінулага стагоддзяў. Пік вылаву ў беларускіх губернях прыйшоўся на 1870—1880-я гады, калі за сезон рыбацкія арцелі выцягвалі з глыбіні па чатыры тысячы тон рыбы. Гэта без уліку аматарскай лоўлі, якая, аб чым яшчэ будзе сказана, нашмат перавышае прамысловую.

Нават у тую экалагічна чыстую эпоху, калі ўсё жывое мела значна больш шанцаў на хуткае аднаўленне папуляцый, такі шалёны наступ на падводнае царства не мог прайсці бясследна. Неўзабаве здабыча пакрытых луской «карысных выкапняў» рэзка ўпала. У пачатку XX стагоддзя на ўсёй Беларусі яна не перавышала 700 тон у год. Толькі тэхнічны прагрэс дазволіў рыбалоўнаму промыслу падняцца са дна. Перад Першай сусветнай вайной сезонны ўлоў даходзіў ужо да паўтары тысячы тон.

Войны і рэвалюцыі прымусілі забыць пра мірную працу. Толькі з аднаўленнем нармальнага жыцця стаў адраджацца і рыбны промысел. Перад гітлераўскім нашэсцем савецкая Беларусь пабіла ўжо згаданы рэкорд — гадавы ўлоў перавысіў чатыры тысячы тон. Пасля Вялікай Айчыннай здабыча рыбы ў натуральных вадаёмах рэспублікі спешна набірала абароты (трэба было чымсьці карміць галодных людзей), але дасягнуць перадваеннага ўзроўню не ўдалося. Ні тады, ні да гэтага часу.

Праўда, цяпер мы апынуліся далёка ад рэкордаў ужо не па прычыне абмежаваных магчымасцяў, а з-за рэзкага зніжэння попыту на малакаштоўныя віды рыбнай фаўны. У гады пасляваеннай разрухі радаваліся любым прадуктам. Таму і рыбку елі ўсякую. Напрыклад, у 1953 годзе амаль з трох тысяч тон беларускага ўлову тры чвэрці склалі плотка, верхаводка, ёрш і іншыя нізкапародныя асобіны. А, скажам, у 2010-м — наадварот, на іх прыйшлася толькі чацвёртая частка ўлову. Таму і ў цэлым ён быў зусім невялікі — менш за 500 тон.

Вядома, справа не толькі ў эканоміцы. Пры жаданні любой рыбіны, нават самай неапетытнай, можна знайсці прымяненне. Дастаткова ўспомніць, што гэта цудоўны, багаты на карысныя мікраэлементы корм для жывёлы і птушкі. Але ў пагоні за прыбыткам, звязаным з рыбным промыслам, мы рызыкуем застацца не толькі без самой рыбы, але і без многіх іншых прадстаўнікоў жывёльнага свету, якія ў прыродзе складаюць адзіны харчовы ланцужок.

Сёння штогадовы ўлоў лускавата-хвастатай жыўнасці ў прамысловых мэтах стабілізаваўся і складае каля тысячы тон. Як адзначаюць навукоўцы, на дадзеным этапе гэта найбольш аптымальны варыянт эксплуатацыі беларускай іхтыяфаўны. Ён дазваляе, з аднаго боку, падтрымліваць дзейнасць галіны, з другога — дае магчымасць водным насельнікам аднаўляць сваю колькасць.

### ЧАГО ЧАКАЦЬ АД НОВАГА ПЕРАПІСУ?

На пачатак 1990-х гадоў дзікай рыбы ў натуральных вадаёмах Беларусі налічвалася каля 27 тысяч тон. Нельга сцвярджаць, што гэта было казачнае багацце. Але ўсё ж які-ніякі ўзровень. Ён падтрымліваўся сумеснымі намаганнямі галіновых прадпрыемстваў, рыбаахоўных структур, навуковых інстытутаў, грамадскіх арганізацый.

Сітуацыя кардынальна змянілася пасля распаду СССР. «Вялікая крымінальная рэвалюцыя» закранула і Беларусь. Адным з яе атрыбутаў быў неверагодны рост браканьерства. Парушальнікі закону адчувалі сябе яшчэ больш прывольна, чым рыба ў вадзе. Кампетэнтныя службы даставалі з рэк і азёраў кіламетровыя сеткі. Купіць іх зламыснікі маглі без напружання. Толькі пасля таго, як у 2001 годзе свабодны продаж гэтых прылад забаранілі, а ў 2003-м пры Прэзідэнце была створана Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету, злачынны промысел рэзка пайшоў на спад. Але наступствы яго адчуваліся даволі доўга. Яшчэ ў сярэдзіне двухтысячных, па падліках навукоўцаў, агульная колькасць рыбы ў натуральных вадаёмах краіны не перавышала і 17 тысяч тон.

— Прычына была не толькі ў браканьерстве, — адзначае **загадчык адной з лабараторый Інстытута рыбнай гаспадаркі Беларусі Уладзімір КАСТАВУСАЎ.** — Вымушала жадаць лепшага сама арганізацыя дадзенага промыслу, як, дарэчы, і многіх іншых відаў эканамічнай дзейнасці ў той час. Адмоўныя наступствы мела таксама забруджванне вадаёмаў прамысловымі адходамі, элементамі хімічнай апрацоўкі сельскагаспадарчых угоддзяў. Цяпер стан экасістэм значна палепшыўся. Гэтаму спрыялі ў тым ліку ўвядзенне квот на вылаў рыбы і штогадовае папаўненне яе запасаў штучным спосабам. Зараз на колькасць прадстаўнікоў іхтыяфаўны ўплываюць у асноўным толькі такія прыродна-кліматычныя фактары, як колькасць дажджоў, тэмпература, працягласць і маштаб паводкі.

Ёсць усе падставы меркаваць, што распачаты навукоўцамі чарговы маніторынг рыбных рэсурсаў краіны пераканае ў пераадоленні крызісу. Чакаць яшчэ больш значных вынікаў не трэба. Не дазволіць прыродная кармавая база, якая ў найбліжэйшы час наўрад ці палепшыцца.

### ПАЛЯВАННЕ НА «АРЫСТАКРАТАЎ»

На жаль, не варта спадзявацца і на павелічэнне колькасці элітных відаў рыбы — шчупака, жэраха, мянтуза, сома, судака. Мала таго, што на гэтых драпежніках сканцэнтраваны намаганні прамыславікоў, дык на іх вядзецца яшчэ і нястрымнае паляванне рыбаловаў-аматараў. Дарэчы, па статыстыцы, «мірнае паляўнічых» вылоўліваюць рыбы ў 7-8 разоў больш, чым здабываюць усе разам узятыя суб'екты гаспадарання ў прамысловых мэтах. Аднак метад ацэнкі маштабаў аматарскай лоўлі настолькі недасканалы (ён заснаваны на апытаннях грамадзян), што многія спецыялісты яму не давяраюць. І лічаць, што рыбакі-адзіночкі рэгулярна маюць куды больш багатыя ўлоў, чым прынята думаць.

А ці можна не ўсумніцца ў праўдзівасці статыстычных даных, калі бачыш, у якіх «даспехах» выходзяць на промысел аматары "актыўнага адпачынку на вадзе"? Чаго варта толькі «абмундзіроўка» для падводнага палявання або тролінгу (лоўлі з катара на ходу). Не дзіўна, што 60 працэнтаў драпежных відаў рыб, якія ўяўляюць сабой найбольшую каштоўнасць, маюць патрэбу ў аднаўленні. У апошнія 10 гадоў яны складаюць толькі дзясятую частку прамысловага ўлову, з якой палова прыпадае на шчупака. А такая парода як сіг ужо перастала трапляць у сеткі. Відаць, пара і яе заносіць у Чырвоную кнігу Беларусі, куды даўно трапілі сцерлядзь, еўрапейскі харыус, атлантычны ласось, ручаёвая фарэль і іншыя «арыстакраты». Як бы ні было горка гэта ўсведамляць, на працягу папярэдняга стагоддзя з беларускіх рэк і азёраў цалкам зніклі дзевяць відаў рыб, сярод якіх выразуб, бялуга, рускі асетр. Глытаючы слінкі пры згадванні гэтых шляхецкіх родаў падводнага каралеўства, міжволі пачынаеш зайздросціць нашым старажытным продкам, якія мелі ў рэках і азёрах такі скарб.

Зрэшты, з тых часоў колькасць насельніцтва настолькі вырасла, што сёння разлічваць на дзікую рыбу ўласных рэк і азёраў як на сур'ёзную долю ў харчовым рацыёне не прыходзіцца. Нават калі б плаўніковае пагалоўе было нашмат большым, задаволіць ім наш апетыт было б немагчыма. Жыхары Беларусі з'ядаюць за год да 160 тысяч тон рыбы. Так што калі б не яе пастаўкі з марскіх дзяржаў, то і ярша з карасём прызнавалі б за далікатэс.

### ЖЫВІ, РЫБКА, ВЯЛІКАЯ І МАЛЕНЬКАЯ!

І ўсё ж барацьба за ўласныя рыбныя рэсурсы ў нашай краіне не спыняецца. Адным з самых дзейсных спосабаў захавання разнастайнай іхтыяфаўны з'яўляецца штогадовае зарыбленне вадаёмаў, дзе на сённяшні дзень жыве больш за 60 відаў рыб. Палова з іх мае значэнне для промыслу. Таму прадпрыемствы, якія займаюцца гэтай дзейнасцю, абавязаны клапаціцца аб аднаўленні папуляцыі рыб.

— Толькі летась, — расказвае **начальнік аддзела рыбалоўнай гаспадаркі і індустрыяльнага рыбаводства Белводгаса Андрэй СЯРГЕЕЎ,** — у натуральныя вадаёмы рэспублікі запушчана амаль 100 тон малькоў рознага ўзросту. У асноўным гэта карп, карась, белы амур, таўсталобік, шчупак, сом і іншыя.

Занятак гэта не танны. Напрыклад, кілаграм маленькіх шчупачкоў, што выводзяць у спецыяльных рэзервацыях і затым выпускаюць у дзікую прыроду, каштуе больш за пяць рублёў. А штогадовая колькасць такіх навасёлаў складае каля 20—25 тон.

### ДЗЕ Ж ТЫЯ РЫБНЫЯ МЯСЦІНЫ?

Толькі дзякуючы мноству мер, і ў першую чаргу штучнаму ўзнаўленню рыбінага грамадства, мы ўсё яшчэ можам ганарыцца яго адноснай пародзістасцю і разнастайнасцю. Самай густанаселенай і разнастайнай іхтыяфаўнай на тэрыторыі Беларусі вылучаюцца рэкі Прыпяць, Сож, Дняпро ў яго паўднёвай плыні, азёры Чырвонае на Гомельшчыне, Лукомскае і Дрывяты на Віцебшчыне, Белае на Брэстчыне і ў гэтай жа вобласці вадасховішча «Сялец». Так што, калі хто не ведае рыбных мясцін, то шукаць іх трэба перш за ўсё там. Але, сябры, давайце не прыпадабняцца да тых, хто ператварыў цывілізаваную рыбалку, гэты цудоўны спосаб зносін з прыродай, у варварскі сродак нажывы. Хаця б для таго, каб пазбегнуць лёсу персанажа яшчэ аднаго анекдота пра разлазаваных рыб, якія задзяўблі рыбака, што ўпаў у ваду.

**Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




## СУСТРЭЧА З КАРАЛЕВАЙ

Нешта добрае пра сябе людзі расказваюць з ахвотай, нешта смешнае — не заўжды. Гэты чалавек на пачатку 80-х толькі пачынаў сваё ўзыходжанне па службовай лесвіцы.

Дык вось (сам расказваў) запрасілі яго, на той час маладога спецыяліста, на нейкую адказную нараду ў райкам партыі. Прысутнічаць ён за гонар лічыў: пагаліўся перад ёй, прыбраўся і, вядома ж, паехаў. Для большай самавітасці яшчэ і блакнот з сабой прыхапіў, аловак.

«Прамоўцаў» слухаў вельмі ўважліва, з самым разумным выглядам круцячы ў руках аловак, тое-сёе запісваў, бо трэба ж было сябе паказваць — найперш начальству. Яно — высокае раённае — сядзела за сталом прэзідыума, насупраць астатніх. І — што гэта? — глядзела на... яго яснымі вочкамі вельмі сімпатычнай маладзіцы!

Сяргей аж разгубіўся: апусціў галаву — нібыта паглядзеў свае запісы... А падняў — і яшчэ раз сустрэў той позірк! Памылкі быць не магло: яго не проста заўважылі, ён, трэба разумець, спадабаўся?!

Каб замацаваць уражанне, хлопец неўпрыкмет прыгладзіў свой пшанічны чуб, паправіў каўнер сарочкі, расправіў плечы. «Каралева з прэзідыума» — так ён назваў сваю незнаёмку — пахвальна ўсміхалася і...

У блакнот ён нічога больш не запісваў, ды і наўрад ці што-небудзь чуў, бо неадрыўна глядзеў на сваю (!) харашуху: ёй, зграбненькай, стройнай, вельмі пасаваў строгі шэры пінжачок, белая блузка...

Спытаць бы яшчэ, хто такая?

Побач з зацікаўленым хлопцам сядзеў трохі знаёмы пажылы аграном. Сяргей хацеў распытаць яго, як завуць гэтую дзяўчыну, дзе яна працуе, ці замужам, але чалавек так соладка спаў... Яно і зразумела: жніво ў разгары, дома не хутка выспішся.

Пашкадаваў будзіць... Вырашыў дзейнічаць сам: пачакаць, пакуль скончыцца нарада, затрымаць дзяўчыну і пазнаёміцца.

Але ж тут, як кажа сучасная моладзь, хлопца чакаў аблом: прэзідыум выйшаў з залы раней і пакуль Сяргей прарываўся праз натоўп, яго сімпатыя паспела знікнуць — як скрозь зямлю праваліцца!

Усхваляваны кавалер яшчэ спадзяваўся перахапіць яе ўнізе, у фае: яна ж павінна выйсці з памяшкання?

Патаптаўся там туды-сюды, пачакаў, мімаходзь зірнуў у люстэрка і... нічога не зразумеў: пад левым вокам у яго быў здараненны фіялетавы... сіняк.

Сяргей памацаў вока — не баліць. Пацёр — і ўсё зразумеў: круцячы аловак, ён графітам спэцкаў пальцы, потым правёў па твары. Дык вось чаму дзяўчына ўсміхалася! А ён падумаў...

Хлопец хуценька сцёр «сіняк» і лёгкім за дзверы.

...Потым з «каралевай прэзідыума» ён не раз сутыкаўся, але выгляд рабіў, што ніколі яе не бачыў.

А між іншым, дарэмна: Сяргей быў прыгожы хлопец, так што прыцягнуць жаночы позірк мог зусім не сіняк.

**Алена Несцяронак,**
*г. п. Докшыцы.*

## ПАД НУМАРАМ АДЗІН

«Москва... Как много в этом звуке // Для сердца русского слилось!»

Для беларускага — перафразуючы Пушкіна — мусіць, не меней злілося ў словах «вёска», «дача». Бо яны для чалавека тутэйшага і праца, і свежае паветра, і грыбы-ягады, і рыбалка, і шчырыя задушэўныя размовы, і, вядома ж, свае буракі-агуркокі...

Адзінае — усе ў гэты год доўга зачакаліся: вельмі доўга не было, а таму гароды стараліся паліваць амаль штовечар, бо трэба ж, каб нешта ўзышло, каб хаця падрасло, не прапала! Добра нашаму суседу, ён на лецішчы ўвесь сезон жыве, можа дагледзець кожную раслінку.

Але ж неяк і ён ходзіць паміж град, потым азіраецца і вачам не верыць: ззаду ў яго певень з курамі — «правяраюць» ці правільна ягоная жонка моркву прарвала.

Сусед гэтых «рэвізораў» давай зганяць (куры ўрассыпную), давай крычаць, што бесталковыя, што ад іх не столькі яек, колькі шкоды. А найболей — ад пеўня, ад «правадыра»...

Карацей, пакуль выганяў, — змогся: забыў, што трэба рабіць, а жонка ж загадала...

— Ты б на ўсякі выпадак зранку спісак складаў, — параіў чалавеку мой муж.

— О-о-о, спіс — гэта добра, — у адказ яму засмяяўся сусед, — а калі такі, як у дзядзькі Сцяпана, то і рагатоў...

Далей, як вы разумееце, быў праўдзівы расказ.

Жыў, значыць, той Сцяпан у вёсцы, трымаў гаспадарку. З жонкай Марусяй штогод гадаваў кувурант, каб маладзенькіх пеўнікаў увосень засекчы на мяса альбо прадаць ды купіць сабе чаго іншага.

Дык вось збіраецца гаспадар на базар. Маруся (скажы — дык вечна нешта забудзецца) спісак яму ў рукі, што потым купіць.

Муж уважліва прачытаў яго ды кажа:

— А што гэта ўсё ў дом ды табе? Я, можна падумаць, ні пры чым: не даглядаў тых пеўнікаў, на гасцінец права не маю?

Паглядзела жонка ў паперчыну, і сапраўды — несправядліва атрымалася.

— Дапішы, — сказала, — і сабе што-небудзь.

Глянуў муж на спіс — месца вольнае толькі зверху. Ну і вывеў там першым радком: «Чакушка».

...Пеўнікаў на базары ён прадаў удала. Зайшоў у краму, узяў, як і «належала», першае, што пазначана ў спісе, — выйшаў і выпіў. На душы ў яго пацяплела, павесялела, але ж мазгі не адключыліся: помніў Сцяпан, пра жончыны даручэнні.

Таму зноў завітаў у краму, зноў купіў тое, што значылася ў спісе пад нумарам адзін...

Калі і трэцяя чакушка была асушана, аднавяскоўцы, якія таксама прыязджалі на рынак, ужо заўважылі, што Сцяпан, можна сказаць, ніякі, і што для дома ён нічога не купіў. А таму загадалі дастаць той спісак (ён паказаў ім на першы пункт!), потым дапамаглі тое-сёе набыць ды павезлі чалавека дамоў. Ад бяды падалей... А то яшчэ міліцыя прычэпіцца.

...З тых часоў Сцяпана празвалі Чакушкай, яго Марусю — Чакушкавай... І ад яе, дарэчы, моду ўзялі, робячы спісы, ні ў якім разе не пакідаць месца ў самым пачатку, бо хто ведае, што там можа з'явіцца пад нумарам адзін.

**Лілія Скіндзер,**
*г. Івацэвічы.*

## ПРАВІЛА І ВЫКЛЮЧЭННЕ

У пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя наш акадэмічны Інстытут мовазнаўства распачынаў стварэнне дыялекталагічнага атласа беларускай мовы. Для яго падрыхтоўкі трэба было пабываць у розных кутočках краіны і зафіксаваць адметнасці мясцовага маўлення. Велізарны аб'ём работы: адным спецыялістам-мовазнаўцам ён наўрад ці быў бы пад сілу. Таму да нас на філфак БДУ завітала прафесар Марыя Андрэеўна Жыдовіч, заклікала дапамагчы. Студэнты, вядома ж, з ахвотай згадзіліся. Мяне асабіста прывабіла магчымасць пабываць на Палессі, пра якое так хораша пісаў Якуб Колас.

І вось наша група выходзіць на станцыі Івацэвічы. Мы з «напарнікам» Міколам на спадарожнай машыне дабіраемся да вёскі Выганашчы. Уладкоўваемся на пастой да спагадлівай жанчыны, купаемся ў прахалоднай, буравата вадзе возера Выганаўскае. А далей...

Увесь свой час мы з Міколам праводзім на людзях. Гутарым з імі ў хатах, на фермах, на вуліцах, сядзім на лавачках, ходзім на вечарынкі і толькі паспяваем запісваць моўныя адметнасці краю.

Карацей, праца ішла, усё выдатна было, пакуль аднойчы нас... не затрымалі.

— Хто такія і што тут робіце? — грозна спытаў мясцовы ўчастковы.

Мы паказалі свае камандзіровачныя пасведчанні, сказалі, што выконваем заданне Акадэміі навук. Але нас як быццам не чулі:

— Вы людзей баламуціце, — гнуў сваё ўчастковы. — А я — не дазволю! Вось зараз арыштую вас, завяду да начальства...

Слухаць гэта было вельмі непрыемна. «Добра, што камандзіроўка ўжо канчаецца, — падумалі мы з Міколам, — што заданне выканалі. А то, відаць, не адкараскацца было б ад гэтага «ўнтара Прышыбеева».

— Вымятайцеся адсюль, — загадаў ён.

Мы таксама нешта даводзілі...

Факт, што размова атрымалася зусім не кароткай. Мы з Колем потым па звычцы «пракруцілі» яе ў памяці. І вось што здзівіла: участковы быў першым чалавекам, у гаворцы якога пры ўсім жаданні мы не знайшлі ніводнай моўнай адметнасці!

Пра гэтае дзіва расказалі потым сваім сябрам, іншым удзельнікам экспедыцыі — разам пасмяяліся.

**Віктар Несцяровіч,**
*г. Лагойск.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ВЯСКОВЫ МУНДЗІЯЛЬ

## Нечаканая экспрэсія пасля сусветнага футбольнага свята

Не ведаю, як вы, а я люблю футбол. Ёсць у гэтай гульні нейкая прыцягальная сіла, нейкая магія, што прымушае мільёны людзей кідаць усе справы і зачаравана глядзець, як дваццаць два здаровых дзецюкі качаюць па полі мяч. Але не толькі ў гэтым справа. Да таго, як у маім свядомым жыцці з'явіўся футбол высокага ўзроўню (які паказваюць па тэлевізары, у які гуляюць мільянеры), там ужо аднойчы і назаўжды пасяліўся футбол вясковы — з дзяцінства не менш прыцягальны і магічны.

Тады тэлевізары былі спрэс чорна-белыя, з пукатым экранам, з механічным пераключэннем каналаў (пластмасавы пераключальнік хутка адломваўся, і замест яго выкарыстоўваліся абцугі). Да таго ж на экране ўвесь час мяцеліла: лакатары вайсковай часці, што знаходзілася непадалёк, стваралі слабенькім вясковым антэнам непераадольныя перашкоды. Так што футбол высокага ўзроўню глядзець было не тое што нецікава — практычна немагчыма. І «рука бога» Марадоны ў тым 86-м прайшла міма і не выклікала ў нашых аматараў гульні эмоцый і бурных спрэчак. Ну і што з таго? У нас быў свой ФУТБОЛ!

ГЭТА слова пачынала лунаць у паветры надвячоркам, калі стомленае сонца павісала над хмызамі, прабіваючы негарачымі ўжо промнямі пыл, які ўзняў на вуліцы сыты статак, ідучы з поля дадому. Кабеты і бабулі, што сядзелі паўсюль на лаўках, разыходзіліся даіць кароў, над вёскай павісала шчыльная цішыня, толькі зрэдку рыпеў запознены воз сена, якое гаспадары везлі з далёкай дзялянкі. І раптам у гэтай цішыні раздавалася пазнавальнае, ні з чым не параўнальнае «гуп!» — стук футбольнага мяча аб высушаную сонцам, утаптаную калёсамі, нагамі, капытамі незаасфальтаваную вуліцу. Гэта быў своеасаблівы сігнал. Той, у каго ў руках быў мяч, ішоў па вёсцы і раз-пораз стукаў ім аб зямлю. На гэта «гуп» ці не з кожнага двара выходзілі гульцы — дзецюкі і хлопцы-старшакласнікі, і заўзятары — у асноўным малеча і падлеткі, але здаралася, шпарылі на высокіх абцасах і гарадскія ўнучкі вяскоўцаў, прыбраныя, нафарбаваныя — зразумела, не з-за футбола, а з-за футбалістаў. Па дарозе да футбольнага поля — «балота», куды і вяла адзіная доўгая вясковая вуліца, назбіралася ўжо цэлая стракатая працэсія — большая хадзіла хіба што ў сярэдзіне жніўня на святога Роха, калі, нягледзячы на забароны атэістычнага начальства, абраз мясцовага заступніка штогод абносілі вакол вёскі.

Гулялі ў футбол сапраўды на балоце, праўда, на высахлым. З уласна футбольнага антуражу там былі толькі вароты — збітыя з жэрдак прамавугольнікі. Усё астатняе нібыта мелася на ўвазе. Заўзятары размяшчаліся хто дзе хацеў, кіруючыся выключна адчуваннем уласнай бяспекі — атрымаць цяжкім і не вельмі чыстым мячом па галаве можна было вельмі проста. Праўда, асабліва цікаўных малых ды дзеўчак на абцасах гэткая рызыка не спыняла, і яны лезлі ледзь не ў самыя вароты, за што футбалісты ў запале гульні на іх лаяліся, не асабліва выбіраючы словы...

КАЛІ шчыра, футбол той быў без ніякіх правіл. Гульцоў на полі было столькі, колькі прыходзіла — проста дзяліліся пароўну на дзве каманды. Суддзя як пасада адсутнічаў увогуле. Адпаведна не было ні штрафных, ні пенальці, ні фіксацыі па-за гульнёй. Не было фіксаванага часу — здаралася, гулялі да першых зорак, калі мяч ужо ледзь прагляддаўся ў лёгкім тумане, што падымаўся ад недалёкай рэчкі. Па сутнасці, па тым балоце проста бегаў натоўп хлопцаў, якія, забіраючы адзін у аднаго мяч, стараліся загнаць яго ў адны ці другія вароты. (Хоць, напэўна, тут можна паразумнічаць і сказаць, што ў такім вось выглядзе футбол быў надзвычай блізка да сваёй першакрыніцы.)

Але была ў той немудрагелістай вясковай гульні нейкая сапраўдная магія. Хлопцам, якія ганялі ўвечары мяч, заставалася паспаць некалькі гадзін: большасць з іх працавалі механізатарамі ў саўгасе і ўжо з усходам сонца сядзелі за рулём камбайна, трактара, «немца»-сенакасілкі. Што цягнула іх, напрацаваных, стомленых, на тое вечаровае балота? Чаму для малых — і мясцовых, і тых, што прыязджалі з горада да бабуль на лета, гэты нехлямяжы вясковы футбол быў сапраўдным святам, далучыцца да якога нават у якасці гледача лічылася за шчасце? Нават праз шмат гадоў, калі з'яўляецца здольнасць аб'ектыўна ацэньваць успаміны, на гэтыя простыя пытанні немагчыма знайсці які-кольвек абгрунтаваны адказ.

Мая дзяўчына ўпэўненая, што за рахунак у рэстаране мы павінны плаціць пароўну, нават калі яна была з мамай.

А я — дома...

**— Вы рыбак?**
**— Толькі па святах і пад добрую закуску.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2654.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

20 ліпеня 2018 г. № 29 (462)


## Дзе вучаць «на дэпутата»?



У новай рубрыцы «100 дзён» мы ўсё раскажам стар. 3

## Красамоўны шлагбаум?



Што чакае замежнікаў у бязвізавай зоне... стар. 13

## У пошуках свайго месца



Як справіцца з дысбалансам на рынку працы стар. 15

## Камунальны жах!



З ім штодзённа сутыкаюцца жыхары вёскі Пугляі стар. 16

## Каму парэчкі?



Чаму нарыхтоўшчыкі перасталі іх прымаць стар. 16

ТЭМА ТЫДНЯ

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

## Уязны турызм: назіраецца станоўчая дынаміка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Турызм — гэта перш за ўсё матывацыя, жаданне наведаць краіну, убачыць яе адметнасці, адпачыць у пэўным месцы. А яшчэ ён становіцца істотным рухавіком росту сусветнай эканомікі. Турызм наўпрост звязаны з развіццём транспарту і камунікацый, будаўніцтвам, сельскай гаспадаркай, гандлем, фінансава-банкаўскай сістэмай, сферай гасціннасці і паслуг. Пра гэта ішла гаворка падчас штогадовага семінара кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Беларусі.**

стар. 4

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# ЗРАЗУМЕЛЫ «КВАДРАТ»

## Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса рыхтуецца да другога чытання

**Законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін» быў прыняты Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні 17 мая. «Гэта было канцэптуальным прынцыпам, да другога чытання будуць улічаны ўсе прапановы па дакументу», — тлумачыць куратар праекта ў Палаце прадстаўнікоў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Аксана ГАЙДУК.**

Дзеючы Жыллёвы кодэкс уступіў у сілу параўнальна нядаўна — у 2012 годзе. За гэты час выйшлі тры асноўныя дакументы, якія ўтрымліваюць прынцыповыя змены ў сферы жыллёвага заканадаўства. У 2013 годзе прыняты Указ Прэзідэнта № 563, які прадугледжваў пераход дзяржаўнага жылля ў арэнднае. У 2015 годзе падпісаны два ўказы: № 535, які забяспечыў празрыстасць выдаткаў насельніцтва на тэхнічнае абслугоўванне жылога дома, і № 536, які павысіў адказнасць старшынь таварыстваў уласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў. Усе гэтыя нарматыўныя акты законапраект замацоўвае ў кодэксе.

«Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса не ўтрымлівае рэвалюцыйных змяненняў, — каментуе Аксана Гайдук. — Яна толькі сістэматызуе і злучае ў адным дакуменце нарматыўныя акты, прынятыя пасля 2012 года. Пры гэтым са структуры Жыллёвага кодэкса выключаюцца раздзелы аб прыватызацыі і дагаворы паднайму, бо два гады таму скончыўся тэрмін для зваротаў грамадзян наконт прыватызацыі, і абавязацельствы па дагаворах паднайму спыненыя».

Абноўлены Кодэкс замацоўвае новую структуру дзяржаўнага жыллёвага фонду, у якую цяпер уваходзяць сацыяльнае жыллё, «квадраты» ў інтэрнатах, спецыяльныя жылыя памяшканні і арэнднае жыллё. Доля арэнднага жылля на пачатак гэтага года складала 50,5 % ад агульнай плошчы дзяржаўнага жыллёвага фонду.

«Стварэнне фонду дзяржаўнага арэнднага жылля дае станоўчы эфект, — лічыць дэпутат. — Яно паўплывала на зніжэнне цэн на рынку і стала не толькі альтэрнатывай прыватнай арэндзе, але і дадатковай крыніцай сродкаў для будаўніцтва новага і рамонту існуючага арэнднага жылля».

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Акупунктура для сельскай гаспадаркі

*Старшыня Савета Рэспублікі наведаў Брэстчыну*

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ у якасці ўпаўнаважанага Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці рэгулярна вывучае стан спраў у эканоміцы гэтага рэгіёна. У чэрвені спікер верхняй палаты парламента прыняў удзел у нарадзе па пытаннях рэалізацыі комплексных планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця горада Баранавічы і Баранавіцкага раёна да 2020 года. Цяпер ён азнаёміўся з тым, як ідзе ўборка збожжавых, на прыкладзе гаспадарак Баранавіцкага, Ляхавіцкага, Ганцавіцкага і Івацэвіцкага раёнаў.**



Фота БелТА.

На Брэстчыне жніво ў разгары. Падрыхтаванасць збожжаўборачных камбайнаў і зернесушыльных комплексаў на пачатак трэцяга тыдня ліпеня складала 98 %, паведамляе БелТА са спасылкай на міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца. Па словах старшыні абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віталя Кулака, вобласць планавала задзейнічаць 1478 збожжаўборачных камбайнаў, з іх каля чатырох дзясяткаў новых.

На раніцу аўторка было ўбрана 22,5 % плошчаў збожжавых, намалочана больш за 200 тысяч тон азімых. На старце кампаніі ўраджайнасць збожжавых склала 27,5 ц/га. Гэта ніжэй за леташнюю, калі было 38 ц/га. Негатыўна паўплывала засуха вясной і напачатку лета. Тым не менш Брэсцкая вобласць плануе сабраць 950 тысяч тон збожжа.

«Мне ўяўляецца, што ўзровень тэхнікі, кадраў досыць высокі і, нягледзячы на тое засушлівае надвор'е, якое было, ураджай чакаецца неблагі, — сказаў журналістам упаўнаважаны Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці. — Можа, некалькі ніжэй прагназуецца па зерневых культурах. Што датычыцца кукурузы, буракоў, думаю, усё будзе нармальна. Апошнім часам вобласць пачала некалькі мінусаваць па нарыхтоўцы травяністых кармоў. Але 10—12 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву будзе. Хацелася б лепш, але ў гэтай сітуацыі будзем дабіраць іншымі культурамі».

Міхаіл Мясніковіч удзяліў асаблівую ўвагу праблемным гаспадаркам Брэстчыны. «Каля 20 % гаспадарак вобласці маюць дрэнныя фінансавыя паказчыкі, — сказаў ён. — Прычым гэта не здарылася год таму, а мае хранічны характар. Таму намаганні абласных, раённых кадраў трэба накіраваць менавіта на тое, каб аднавіць патэнцыял гэтых гаспадарак і такім чынам дадаць у цэлым».

Старшыня Савета Рэспублікі лічыць, што з праблемнымі гаспадаркамі трэба працаваць кропкава, пачынаючы з падбору, падрыхтоўкі і размеркавання кадраў.

# Дасягнуць патрэбнага выніку

**У Віцебску на пашыраным паседжанні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы старшыня камісіі Сяргей РАХМАНАЎ у размове з журналістамі выказаў меркаванне наконт узаемадзеяння Савета Рэспублікі з мясцовымі органамі ўлады.**

Сёння перад краінай ставіцца мэта па выхадзе на новы ўзровень эканамічнага развіцця, для дасягнення якой неабходна падключаць усе рэсурсы, якія маюцца ў наяўнасці, і перш за ўсё інтэлектуальныя, адзначыў сенатар. «Прэзідэнт Беларусі паставіў вельмі сур'ёзную, але вельмі неабходную задачу па дасягненні да 2025 года аб'ёму ВУП у $100 млрд. Для яе рашэння трэба стварыць такую сістэму ўзаемадзеяння, якая б забяспечвала ўдзел усіх адзіным цэлым у дасягненні выніку», — цытуе Сяргея Рахманава БелТА.

У гэтым аспекце важная роля належыць рэгіёнам, узаемадзеянню з якімі Савет Рэспублікі ўдзяляе вялікую ўвагу. «Мы павінны разумець, што неабходна рабіць у краіне, што ў рэгіёнах, і ў нас ёсць канкрэтныя прапановы, заснаваныя на аналітычных даследаваннях, якія мы хочам абмеркаваць з мясцовымі органамі ўлады, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый», — сказаў Сяргей Рахманаў. А пачынаць трэба з аналізу бягучага стану ў краіне, сусветнага вопыту і магчымасці прымянення яго ў Беларусі, што дазволіць выпрацаваць уласнае бачанне развіцця на доўгатэрміновы перыяд. «Неабходна бачыць перспектыву на дзесяцігоддзі наперад, каб рухацца наперад планава, надзейна і стабільна», — адзначыў парламентарый.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

ЭКСПЕРТНАЕ МЕРКАВАННЕ

# БЫЦЬ СУВЯЗНЫМ ЭЛЕМЕНТАМ

## Падчас «Мінскага дыялогу» дыпламат і парламентарый далі ацэнку палітычнаму становішчу ў свеце

**Як сустрэча Дональда Трампа і Уладзіміра Пуціна паўплывае на рэгіён Усходняй Еўропы і Беларусь у прыватнасці? Гэтае і іншыя пытанні сталі цэнтральнымі ў рамках дыскусіі на тэму беларуска-еўрапейскіх адносін у кантэксце амерыкана-расійскага супрацьстаяння. Арганізатарам мерапрыемства выступіла экспертная ініцыятыва «Мінскі дыялог». Сярод запрошаных спікераў былі вядомыя дыпламаты — былы міністр замежных спраў Беларусі Іван АНТАНОВІЧ, а таксама старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах Валерый ВАРАНЕЦКІ.**

Але напачатку варта расказаць пра вынікі «Мінскага барометра». Нагадаем, гэта такая экспертная ініцыятыва, якая займаецца маніторынгам знешняй палітыкі і рэгіянальнай бяспекі Беларусі. Прасцей кажучы, аналітыкі кожныя два месяцы адсочваюць змены ў названых сферах па індэксах, быццам выстаўляючы адзнакі. Трэці выпуск «МБ» за май і чэрвень гэтага года прадставілі ў самым пачатку дыскусіі.

Як адзначыў **палітолаг-міжнароднік, рэдактар маніторынгу Дзяніс МЕЛЬЯНЦОЎ**, у гэты перыяд вектар адносін Беларусі з Еўрапейскім саюзам — 35 пунктаў — упершыню перасягнуў расійскі індэкс — 25 пунктаў. Акрамя таго, рэзка вырасла і інтэнсіўнасць адносін з Кітаем — 31 пункт.

У дакладзе сказана, што ў адносінах з Расіяй пакуль не знайшлі здавальняючага вырашэння канфлікту па пастаўках малочнай прадукцыі. Цікава, што пры гэтым расійскі бок не адмаўляецца ад рэфінансавання даўгоў беларускіх прамысловых прадпрыемстваў і прапаноў аб буйным інвеставанні.

З Еўропай кантакты працягваюць паглыбляцца, з Кітаем развіваецца крэдытнае і праектнае супрацоўніцтва. Што да апошняга, то для будаўніцтва інфраструктуры Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка ажыццяўляецца пошук новых формаў і інструментаў фінансавання.

Індэкс адносін з ЗША знізіўся. У адносінах з Украінай назіраецца станоўчая дынаміка ў непалітычных сферах і на тэхнічным узроўні супрацоўніцтва.

Што датычыцца нацыянальнай бяспекі, то ўрадам падтрымліваецца максімальна магчымая ў беларускіх умовах шматвектарнасць. Узровень рэгіянальнай напружанасці застаецца ў «зялёнай зоне» — прысутнічае ваенная актыўнасць (таму што ў рэгіёне быў праведзены шэраг вучэнняў), але непасрэдна яна не нясе небяспекі і не абавязкова можа весці да эскалацыі напружанасці. Вось такія вынікі.

Валерый Варанецкі падзяліўся сваім меркаваннем з нагоды мінулага саміту ў Хельсінкі, дзе сустрэліся прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. «Я бачу ў гэтым саміце ў большай частцы плюсы для Беларусі», — сказаў дэпутат.

Паводле яго слоў, Расія і ЗША на саміце паказалі імкненне да пошуку пунктаў судакранання, а таксама да работы разам. Што да Усходняй Еўропы, то гэта, безумоўна, зона інтарэсаў Расіі, але і ЗША не маюць намеру саступаць.

«Я тут прагназую пошук кампрамісаў, пошук супрацоўніцтва. Мне гэта дае надзею на тое, што Беларусь не стане полем сапернiцтва за ўплыў, а можа стаць добрай мадэллю новых падыходаў», — дадаў Валерый Варанецкі.

Акрамя таго, дэпутат падкрэсліў: умовы складваюцца так, што і Захад, і Расія будуць шукаць рашэнні, якія б задавальнялі абодва бакі.

Па выніках мерапрыемства спікераў папрасілі выказаць адну думку, якую кожны прысутны на мерапрыемстве павінен зразумець з нагоды падзей у сусветнай палітыцы. Валерый Варанецкі адзначыў, што зыходзячы з сусветнага парадку ў яго з'явілася больш упэўненасці ў тым, што роля Беларусі і ў нашым рэгіёне, і ў Еўропе будзе ўзрастаць.

Дзяніс Мельянцоў падкрэсліў, што ў Беларусі ўсё будзе добра, але далей ёсць нюансы па канкрэтных пытаннях з еўрапейскімі партнёрамі, якія трэба вырашаць як мага хутчэй.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ЗРАЗУМЕЛЫ «КВАДРАТ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У кодэксе прапануецца замацаваць, што памер платы за карыстанне арэндным жыллём устанаўліваецца на падставе базавай стаўкі і каэфіцыента ў залежнасці ад ступені добраўпарадкаванасці і месцазнаходжання. Базавая стаўка вызначацца ўрадам, сёння яна складае 0,2 базавай велічыні або 4 руб. 90 кап. за квадратны метр.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Максімальны тэрмін дзеяння дагавора найму арэнднага жылля абмяжоўваецца альбо перыядам працоўных адносін альбо пры агульным парадку давання — 5 гадамі з абавязковым яго працягам пры належным выкананні наймальнікамі сваіх абавязацельстваў.

Новая рэдакцыя кодэкса фіксуе дакладныя падставы для высялення з арэнднага жылля: спыненне працоўных адносін з арганізацыяй, якая забяспечвала жыллём на час работы; запазычанасць без уважлівых прычын за арэнду і камунальныя паслугі; заканчэнне тэрміну дзеяння дагавора арэнды пры неналежным выкананні наймальнікамі сваіх абавязацельстваў.

Законапраект прадугледжвае выключную адказнасць уласнікаў жылых памяшканняў (незалежна ад формы уласнасці) за іх утрыманне. «У сувязі з гэтым абавязак па ўтрыманні ўсяго дзяржаўнага жыллёвага фонду, у тым ліку арэнднага і сацыяльнага жылля, будзе накладацца не на наймальніка — часовага «карыстальніка», які плаціць арэндную плату, а на выканкамы як прадстаўнікоў дзяржавы (уласніка) гэтых кватэр», — удакладняе Аксана Гайдук.

Парламентарый падкрэслівае, што сацыяльныя гарантыі неабароненых груп насельніцтва, а таксама тых, хто мае асаблівыя заслугі перад дзяржавай, не толькі захоўваюцца ў новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса, але і ўзмацняюцца. Праект прадугледжвае права пазачарговага ўключэння ў арганізацыі забудоўшчыкаў ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Цяпер на чарзе знаходзіцца каля 620 воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Яшчэ адна важная норма — магчымасць перадачы арэнднага жылля ў сацыяльнае для неабароненых катэгорый грамадзян, якія там пражываюць. Такі перавод можна зрабіць толькі аднойчы.

У выпадках прызнання жылля, якое знаходзіцца ў долевай уласнасці, непрыдатным для пражывання, прадугледжваецца выплата грашовай кампенсацыі кожнаму з уласнікаў (цяпер такая кампенсацыя выплачваецца толькі аднаму ўласніку). Замацоўваецца абавязак удзельнікаў долевай уласнасці адпаведна сваёй долі аплачваць камунальныя паслугі.

Устанаўліваецца адзіны падыход пры высяленні грамадзян з любога дзяржаўнага жылля ў выпадках яго сістэматычнага (тры і болей разоў на працягу каляндарнага года) разбурэння або псавання, выкарыстання не па прызначэнні або сістэматычнага парушэння правілаў карыстання жылымі памяшканнямі і правілаў пажарнай бяспекі, з-за якіх немагчыма для іншых сумеснае пражыванне з імі ў адным жылым доме.

«Праект новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса замацоўвае тое новае і перспектыўнае, што зроблена ў жыллёвай палітыцы дзяржавы за апошнія гады, і захоўвае пры гэтым сацыяльную накіраванасць існуючага прававога механізма рэалізацыі грамадзянамі канстытуцыйнага права на жыллё», — рэзюмуе куратар законапраекта ў Палаце прадстаўнікоў.

Парламентарый адзначае, што адбылося грамадскае абмеркаванне законапраекта ў маі-чэрвені на сайце «Прававы форум Беларусі», і ўсе выказаныя прапановы і заўвагі былі ўлічаныя.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ПРЫКЛАД КАЛЕГ — ВУЧОБА ДЛЯ ДЭПУТАТА

**— Дэпутат — гэта не прафесія, — падкрэслівае старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ. — Няма такіх універсітэтаў, дзе вучаць «на дэпутата». Таму дэпутатам усіх узроўняў даводзіцца падрабязна ўнікаць у асаблівасці работы самых розных галін народнай гаспадаркі. І ўсё для таго, каб мець магчымасць задаць пытанні сваіх выбаршчыкаў адказным асобам, накіраваць запыт у інстанцыю, якая адпавядае азначанай праблеме.**



## Месца дэпутата там, дзе выбаршчык

***— Кацярына Анатолеўна абрана старшынёй абласнога Савета дэпутатаў сёлета. Аднак яе кампетэнцыя на ранейшай пасадзе — кіраўніка камітэта дзяржаўнай маёмасці Гомельскай вобласці — дапамагае ўпэўнена разважаць пра многія праблемы новай работы.***

— На працягу амаль 10 гадоў, калі вырашала задачы па павышэнні эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, я цесна супрацоўнічала з Саветамі ўсіх узроўняў: ад базавага да абласнога. Часта нашы ініцыятывы накіроўваліся Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь. Значная частка пытанняў грамадзян да дэпутатаў звязана з тым, што не заўсёды дзяржаўныя органы кіравання вядуць работу з насельніцтвам на належным узроўні. Здараецца, не ўлічваюць, што зварот паступіў ад сталага чалавека. Або грамадзянін не ў сілах самастойна разабрацца ў існуючым заканадаўстве. У выніку дзяржаўны орган накіроўвае чалавеку незразумелую ці няпоўную інфармацыю. Таму на прамую тэлефонную лінію дэпутатам паступае вялікая колькасць дастаткова простых жыццёвых пытанняў. Напрыклад, людзі цікавяцца: калі адрамантуюць дарогу, калі пакосяць траву, калі прыедуць нарыхтоўшчыкі ягад, чаму зямельны ўчастак вакол дома не афармляюць у пажыццёвае спадчыннае валоданне, а прапануюць у арэнду. У апошнім выпадку нават дэпутат не адразу разбярэцца ў нюансах, хоць усё адно чалавеку трэба дапамагчы. Дарэчы, месца дэпутата ў першую чаргу там, дзе яго выбаршчык.

***— Таму многія вашы мерапрыемствы выязныя і праходзяць практычна ва ўсіх рэгіёнах вобласці?***

— Такім чынам мы можам вучыцца адзін у аднаго. Для гэтага ў Гомельскай вобласці зацверджаны план-графік вучобы старшынь Саветаў першаснага і базавага ўзроўняў, якія цесна ўзаемадзейнічаюць з мясцовымі жыхарамі і змогуць данесці да кожнага інфармацыю па любым пытанні. У нас ужо прайшоў шраг практычных семінараў: у Светлагорскім, Рэчыцкім, Хойніцкім раёнах. На такіх семінарах прысутнічаюць не толькі дэпутаты, але і прадстаўнікі органаў выканаўчай улады, прадпрыемстваў і арганізацый. У кожным раёне сфарміраваўся свой стыль работы, сістэма ўзаемадзеяння паміж органамі ўлады. Падчас такіх мерапрыемстваў удзельнікі адзначаюць для сябе тое, што будзе карысна і запатрабавана ў іх дзейнасці. На гэтых практыкумах заўсёды адбываюцца актыўныя жывыя стасункі і абмен думкамі. Адзначу, што такія семінары, хоць і праходзяць па графіку, не прызначаюцца. Дэпутаты самі выступаюць з ініцыятывай. Прапануюць: рашэнне гэтай праблемы давайце паглядзім у мяне, а гэтай — у іншым раёне.

***— Якія пытанні дэпутаты ўжо вывучалі на такіх семінарах?***

— У першую чаргу тыя, што адносяцца непасрэдна да кампетэнцыі Саветаў. Вялі размову пра бягучыя задачы сельсаветаў, аб рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці», аб практыцы інфармавання насельніцтва пра дзейнасць дэпутатаў, аб узаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання з падраздзяленнямі МНС, аб рэалізацыі дзяржаўнай кадравай палітыкі, аб добраўпарадкаванні... Паўтараю, што гэта не тэарэтычныя заняткі, а вывучэнне практычнай дзейнасці з удзелам прадстаўнікоў органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Вынікам, як правіла, з'яўляюцца пэўныя мерапрыемствы для кожнага Савета.

У дэпутата многа творчай, канкрэтнай і карыснай работы. З улікам таго, што склад Гомельскага абласнога Савета абнавіўся амаль на 60 %, я бачу, што ў нашых дэпутатаў яшчэ не замыліўся погляд на праблемы і магчымасці іх вырашэння.

## Што можа народны абраннік

***— Як Вы лічыце, у дэпутатаў сёння досыць паўнамоцтваў для рашэння праблем выбаршчыкаў?***

— Дэпутаты ўпаўнаважаны прадстаўляць інтарэсы жыхароў сваёй акругі на пасяджэннях Саветаў і ў розных арганізацыях. Акрамя таго, дэпутат Савета мае права на першачарговы прыём службовымі асобамі і доступ у дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі. Ён можа адправіць запыт і зварот, удзельнічаць у праверках работы дзяржаўных органаў і іншых арганізацый. Да выключнай кампетэнцыі мясцовых Саветаў адносіцца зацвярджэнне праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, а таксама рэгіянальных комплексаў мерапрыемстваў па рэалізацыі розных дзяржаўных праграм, бюджэту і справаздач пра іх выкананне, устанаўленне мясцовых падаткаў і збораў, вызначэнне парадку кіравання і распараджэння камунальнай уласнасцю... У дэпутата многа творчай, канкрэтнай і карыснай работы. З улікам таго, што склад Гомельскага абласнога Савета абнавіўся амаль на 60 %, я бачу, што ў нашых дэпутатаў яшчэ не замыліўся погляд на праблемы і магчымасці іх вырашэння.

***— Кацярына Анатолеўна, Вы прайшлі кантрольныя 100 дзён на новай выбарнай пасадзе. Што можаце запісаць у свой актыў?***

— Адбыліся тры сесіі абласнога Савета. Яны прайшлі ў атмасферы жывой палемікі. Мы разглядалі некаторыя перспектыўныя кірункі для развіцця рэгіёна. Мы сфармавалі план сваёй работы на бягучы год. У яго ўключаны першачарговыя, надзённыя задачы. Напрыклад, у канцы чэрвеня мы разгледзелі меры, якія прымаюць мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы па выкананні Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб развіцці прадпрымальніцтва».

***— Улічваючы актуальнасць гэтага пытання, раскажыце падрабязней: якія крокі робяцца ў гэтым кірунку на Гомельшчыне.***

— На працягу шэрагу гадоў у вобласці прыярытэт для выканаўчай улады і Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў — сістэмная работа па развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы, самазанятасці насельніцтва, стварэнні новых працоўных месцаў. Закладзеныя ў Дэкрэце № 7 нормы па ліквідацыі залішніх адміністрацыйных бар'ераў, мінімізацыі ўмяшання дзяржавы ў работу эканамічна актыўных пластоў насельніцтва, узмацненні самарэгулявання бізнесу робяць пытанні яго арганізацыі прасцейшымі, зразумелымі і даступнымі для грамадзян. У Гомельскай вобласці праведзена і працягвае праводзіцца вялікая растлумачальная работа па даведзенні асноўных прынцыпаў гэтага дакументу да людзей. Важна ўцягнуць іх у працэс самазанятасці, зацікавіць у стварэнні або развіцці ўласнай справы. Гэтаму спрыяюць семінары з удзелам прадстаўнікоў бізнес-супольнасцяў. Таксама ў СМІ рэгулярна размяшчаюцца матэрыялы растлумачальнага характару. Праводзяцца адпаведныя сустрэчы і семінары, а на гомельскім абласным тэлебачанні выходзіць цыкл перадач пра магчымасці стварэння сваёй справы.

## Як стымуляваць самазанятасць

***— Наколькі ведаю, у вобласці створана рабочая група, якая ўвесь час праводзіць інфармацыйна-растлумачальную работу на гэты конт...***

— Так, а акрамя таго, арганізаваны штотыднёвы маніторынг рынку працы, які дазваляе прымаць кіраўніцкія рашэнні па забеспячэнні занятасці насельніцтва. Увесь час дзейнічаюць камісіі садзейнічання занятасці ў раённых і гарадскіх выканкамах і мясцовых адміністрацыях. У іх склады ўключаны дэпутаты ўсіх узроўняў, а старшыні раённых ці гарадскіх Саветаў дэпутатаў іх узначальваюць. Камісіі праводзяць шырокую інфармацыйную работу па растлумачэнні сацыяльна-працоўных гарантый, якія даюцца дзяржавай грамадзянам, арыентацыі іх на ажыццяўленне легальнай дзейнасці. Акрамя таго, як вынік гэтай дзейнасці, Гомельскі абласны Савет дэпутатаў у верасні заслухае справаздачу аб рабоце ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва аблвыканкама.



Фота Алены СМУСЯНОК.

***— Прывядзіце, калі ласка, пэўныя прыклады: як дзяржава спрыяе стварэнню новых працоўных месцаў менавіта ў выглядзе самазанятасці.***

— На Гомельшчыне заўсёды ўдзялялася пільная ўвага навядзенню парадку на зямлі, у сельскай мясцовасці, малых гарадах, на кожным прадпрыемстве. Дэпутаты мясцовых Саветаў актыўна ўдзельнічалі ў развіцці сваіх тэрыторый. Мы працягваем гэту работу — асабліва ў Год малой радзімы. Я крыху ўспомню пра работу на папярэднім працоўным месцы, тым больш што гэта цесна звязана з работай Саветаў. Дзяржава актыўна стымулюе прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу набываць дзяржаўную маёмасць, якая не выкарыстоўваецца. Для гэтага ўстаноўлены значныя льготы для набыцця такой маёмасці і вядзення бізнесу з яе выкарыстаннем. На базе набытых на льготных умовах аб'ектаў у Гомельскай вобласці створана больш за 1,5 тысячы новых працоўных месцаў. Улічваючы, што маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, — эканамічны рэзерв для развіцця дзелавой ініцыятывы, у Гомельскай вобласці мясцовымі выканаўчымі камітэтамі з удзелам дэпутатаў Саветаў усіх узроўняў у канцы 2016 года было праведзена маштабнае абследаванне ўсёй тэрыторыі рэгіёна і зроблены высновы пра фактычную эфектыўнасць выкарыстання, забеспячэнне захаванасці нерухомай маёмасці, у тым ліку жыллёвага фонду. Таму пытанні ўцягнення ў гаспадарчы абарот аб'ектаў нерухомасці і зямель, што не выкарыстоўваюцца, — на кантролі прэзідыума абласнога Савета, які разгледзіць справаздачы пра работу органаў кіравання і самакіравання па гэтых кірунках.

> На працягу шэрагу гадоў у вобласці прыярытэт для выканаўчай улады і Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў — сістэмная работа па развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы, самазанятасці насельніцтва, стварэнні новых працоўных месцаў.

***— Але ж Савет дэпутатаў будзе вывучаць і ход выканання іншых задач?***

— Так, напрыклад, рэалізацыю патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Пра дэбюракратызацыю дзяржаўнага апарата і павышэнне якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва», Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 18, кадравую палітыку, выкананне мерапрыемстваў дзяржпраграм «Камфортнае жыллё», «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь», стварэнне ўмоў для развіцця сістэмы адукацыі ў сельскай мясцовасці і многія іншыя. За работай кожнага дэпутата стаіць рашэнне надзённых праблем нашых выбаршчыкаў. У аснове дзяржаўнай палітыкі Беларусі — сацыяльная скіраванасць. І Гомельшчына — яскравы прыклад таго, як павінны рэалізоўвацца сацыяльныя праграмы. Мы будзем працягваць актыўна працаваць над выкананнем усіх пастаўленых задач.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)*

**Міністр спорту і турызму краіны Сяргей КАВАЛЬЧУК** адзначыў, што «ў Беларусі расце разуменне важнасці турыстычнага сектара для сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы. Удасканальваецца інфраструктура, расце колькасць турыстычных аб'ектаў, удзельнікаў турбізнесу». Як вынік — экспарт турыстычных паслуг у 2017 годзе склаў больш за 200 млн долараў (125,7 % да ўзроўню 2016 года). За першыя пяць месяцаў гэтага года Беларусь ужо зарабіла на экспарце турпаслуг каля 90 млн долараў.

## Колькасць наведвальнікаў расце

Турыстычная прывабнасць любой краіны вызначаецца наяўнасцю пэўных умоў: бяспекі, прастаты ўезду, існавання турыстычных аб'ектаў і інфраструктуры, а таксама аптымальных суадносін кошту і якасці. Мабыць, галоўным сакрэтам развіцця ўязнога турызму ў нас у краіне з'яўляецца работа па лібералізацыі візавага рэжыму. Нагадаем, з лютага 2017 года ў Беларусі дзейнічае пяцідзённы бязвізавы рэжым для грамадзян 80 краін. Для ўезду ў Сінявокую пры сабе неабходна мець толькі сапраўдны пашпарт ці іншы дакумент, які яго замяняе, грашовыя сродкі (на кожны дзень знаходжання суму ў валюце або беларускіх рублях, эквівалентную не менш як дзвюм базавым велічыням) і медыцынскі страхавы поліс, які дзейнічае ў Беларусі.

З-за спрошчанага ўезду колькасць гасцей з кожным месяцам расце, напрыклад, па выніках I квартала бягучага года колькасць грамадзян замежных дзяржаў, якія наведалі Беларусь, узрасла на 10,7 % у параўнанні з аналагічным перыядам 2017 года і склала 947,7 тыс. чалавек (2016 год — 856,0). А па стане на 24 мая бязвізавым уездам скарысталіся 113 230 чалавек з 68 краін свету (у тым ліку 457 асоб без грамадзянства). Пры гэтым пасажырапаток праз Нацыянальны аэрапорт вырас больш чым на 20 %.

Больш за ўсё Беларусь наведваюць суседзі — госці з Расіі і Украіны, ну а калі казаць пра Еўропу, то аматарамі нашай краіны можна назваць літоўцаў і палякаў, яны бываюць у нас часцей за іншых. Хоць невялікімі тэмпамі, але павялічваецца колькасць турыстаў з Турцыі і Ізраіля, летась гэты паказчык узрос на 6 %.

Колькасць арганізаваных груп турыстаў і экскурсантаў, якія наведалі краіну летась, узрасла на 30 % у параўнанні з 2016 годам і склала 282 694 чалавекі (2016 год — 217 398 чал.).

## Vetliva для турыстаў

Варта адзначыць, што з 1 студзеня 2018 года ў замежных турыстаў з'явілася магчымасць бязвізавага ўезду на тэрыторыю турыстычна-рэкрэацыйнай зоны «Брэст», а бязвізавае знаходжанне для гасцей на тэрыторыі Гродна і ўсяго Гродзенскага раёна падаўжана да 10 сутак. Гэта ўжо дало добрыя вынікі.

Па словах міністра спорту і турызму, лічбы нядрэнныя, але яны відавочна не адлюстроўваюць патэнцыял Беларусі. Каб павялічваць паток турыстаў, а разам з гэтым рабіць краіну больш камфортнай і сучаснай не толькі для гасцей, але і ў першую чаргу для беларусаў, працягвае прадпрымацца шэраг мер. Напрыклад, ужо запушчаны шматфункцыянальны сэрвіс анлайн-браніравання турыстычных паслуг Vetliva, які працуе ў рэжыме рэальнага часу. Сайт даступны не толькі на беларускай, рускай, англійскай, але яшчэ і на кітайскай мове. Актуалізаваны новы цэнтралізаваны рэсурс аб турыстычных магчымасцях Беларусі для турыстаў www.belarus.travel. Разумеючы, наколькі важную ролю сёння ў свеце адыгрывае інтэрнэт, нельга назваць гэтыя крокі бессэнсоўнымі.



Фота Аляксандра ЛАСМІНСКАГА.

## Як прыцягнуць увагу?

Простая ісціна: каб у краіну прыязджалі, яе трэба рэкламаваць за мяжой. Зараз распачата актыўная работа па развіцці супрацоўніцтва ў сферы турызму з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Міністэрствам спорту і турызму сёлета турыстычны патэнцыял Беларусі ўжо прадстаўлены на трох турыстычных выстаўках у КНР: у Пекіне — на выстаўцы «КОТТМ-2018», на Пятай міжнароднай выстаўцы ў сферы гандлю паслугамі; у Шанхаі — на «Ай ці Бі Чайна». У лістападзе турыстычны патэнцыял краіны будзе прадстаўлены на Кітайскай Народнай міжнароднай выстаўцы імпарту «Чайна Інтэрнэшнл Імпарт Экспа».

У студзені ў Чунцыне прайшла цырымонія адкрыцця Года турызму Беларусі ў Кітаі. Падпісаны адпаведны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным упраўленнем па турызме Кітайскай Народнай Рэспублікі. Урадам нашай краіны зацверджаны план мерапрыемстваў па правядзенні Года турызму Беларусі ў Кітаі з больш чым 50 арганізацыйнымі, маркетынгавымі мерапрыемствамі, а таксама мерапрыемствамі па развіцці турыстычнай інфраструктуры і падрыхтоўцы кадраў. У верасні будзе праведзены азнаямленчы тур для тураператараў з Кітая.

Рэкламуем краіну мы і з дапамогай буйных спартыўных турніраў, якія будзе прымаць Беларусь. Ідзе актыўная работа па папулярызацыі II Еўрапейскіх гульняў 2019 года і чэмпіянату свету па хакеі 2021 года. Гэтыя мерапрыемствы ўжо прарэкламавалі на міжнародных турыстычных выстаўках у Іспаніі, ЗША, Эстоніі, Германіі і Расіі. «Гульні ўжо выклікаюць жывую цікавасць у аматараў спорту. Важна, каб людзі атрымлівалі як мага больш дакладнай інфармацыі пра Беларусь, нашы славутасці, прыемную атмасферу, каб яны захацелі прыехаць сюды і затым пакінулі нашу краіну з добрымі ўражаннямі», — адзначыў Сяргей Кавальчук.

## Адпачынак у вёсцы прываблівае замежнікаў

Працягваюць удасканальвацца і беларускія спецыялісты, якія працуюць у сферы турызму. Нацыянальнае агенцтва па турызме рэгулярна праводзіць выязныя адукацыйныя семінары па абласцях Беларусі. Акрамя таго, арганізацыя запрашае замежных калег для таго, каб паказаць краіну. Напрыклад, у пачатку чэрвеня ў Беларусі пабывалі прадстаўнікі турындустрыі ЗША і Канады. Дарэчы, Беларусь летась і за першы квартал 2018 года наведала больш за 2 тысячы грамадзян Канады і больш за 15 тысяч грамадзян ЗША. Для замежных прадстаўнікоў індустрыі была арганізавана прэзентацыя турыстычнага патэнцыялу Беларусі, шэраг кампаній ЗША і Канады выказалі зацікаўленасць у арганізацыі наведвання турыстычных аб'ектаў нашай краіны.

Першыя поспехі ў развіцці ўязнога турызму ўжо дакладна ёсць. Мінск рэгулярна ўваходзіць у рэйтынг гарадоў, прывабных для адпачынку і спорту. Беларусь штогод займае лідарскія пазіцыі ў намінацыі «Агратурызм» конкурсу, які праводзіцца рускамоўнай версіяй часопіса National Geographic Traveler Awards сярод найлепшых турыстычных дэстынацый.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

❍ У ТЭМУ

## ПА БЯЗВІЗЕ ДА НАС ПРЫЛЯЦЕЛА АМАЛЬ 130 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК

**Бязвізавы рэжым быў уведзены ў Беларусі ад 12 лютага 2017 года Указам Прэзідэнта № 8. Згодна з ім грамадзяне 80 краін (у ліку якіх усе краіны Еўрасаюза, Інданезія, Бразілія, ЗША, Японія і іншыя), якія перасякаюць пункт пропуску на дзяржаўнай мяжы ў Нацыянальным аэрапорце Мінск, могуць знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны без візы да пяці дзён.**

Ад гэтага моманту мінула амаль паўтара года. Пагранічнікі падвялі некаторыя вынікі дзейнасці бязвізу.

— Летась праз Нацыянальны аэрапорт да нас прыбыла амаль 80 тысяч замежных грамадзян больш чым з 60 краін свету, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.** — А вось сёлета з 1 студзеня па 15 ліпеня праз гэты пункт пропуску прайшлі без віз ужо 49 тысяч 302 чалавекі. У топ-3 краін, адкуль да нас па бязвізе прыязджае больш за ўсё людзей, летась трывала трымаліся Германія, Польшча і Літва. Але былі і грамадзяне з даволі экзатычных для нас астраўных краін Ціхаакіянскага рэгіёна.

Цікава, што замежнікі па бязвізе прыязджаюць да нас у асноўным у першай палове тыдня. Такім чынам, сярэднестатыстычны наведвальнік захопіць за пяць сутак не толькі будныя, але і выхадныя дні. Атрымліваецца, што ён сумяшчае і дзелавыя мэты паездкі, і, так бы мовіць, адпачывальныя. А вось якіх-небудзь дзён, калі б назіраліся пікі ад'езду, няма — іншаземцы адлятаюць з Беларусі больш-менш раўнамерна.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ

# АКНО Ў ЧУНЦЫН

## Міншчына ўмацоўвае пабрацімскія сувязі з кітайскім горадам

**У Мінскай вобласці да 22 ліпеня прадоўжацца мерапрыемствы ў межах Дзён культуры і турызму горада Чунцын (Кітайская Народная Рэспубліка). З гэтай нагоды адбылася сустрэча кітайскай дэлегацыі на чале са старшынёй народнага ўрада Чунцына Тан Лянчжы са старшынёй Мінаблвыканкама Анатолем ІСАЧАНКАМ.**

— Сённяшняя падзея сведчыць аб тым, што мы на пачатку вялікага шляху па рэалізацыі сумесных праектаў. Для гэтага ў Беларусі падрыхтаваны адпаведныя пляцоўкі. У прыватнасці, у Мінскай вобласці — Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Па тэрыторыі цэнтральнага рэгіёна пралягае міжнародная чыгуначная магістраль Чунцын — Сіньцзян — Еўропа. У межах ініцыятывы «Адзін пояс — адзін шлях» паміж Чунцынам і Мінскам наладжаны прамыя транспартныя зносіны, — адзначыў Анатоль Ісачанка.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна і старшыня народнага ўрада Чунцына адкрылі Дні культуры і турызму горада Чунцын. У Кітаі гэты год аб'яўлены Годам беларускага турызму, а 10 студзеня 2018 года падпісаны мемарандум аб стратэгічным супрацоўніцтве паміж упраўленнем турызму Чунцына і ўпраўленнем спорту і турызму Мінскай вобласці. «Гэта дазволіць вывесці ўзаемаадносіны нашых рэгіёнаў на новы ўзровень, павялічыць узаемныя патокі турыстаў. Культурныя стасункі таксама важны складнік двухбаковых адносін», — канстатаваў губернатар.

У 2016 годзе падпісаны мемарандум паміж Мінскай абласной бібліятэкай імя Пушкіна і бібліятэкай Чунцына, якая з'яўляецца адной з найбуйнейшых у свеце. У межах яго рэалізуецца культурны праект «Акно ў Чунцын», што дазволіць у далейшым паспяхова ладзіць супрацоўніцтва ў музейнай справе, музыцы, тэатральным мастацтве.

Анатоль Ісачанка і Тан Лянчжы сустрэлі першы поезд Чунцын — Мінск, які даставіў 41 кантэйнер з таварамі лёгкай прамысловасці, электронікай, тканінай на станцыю Калядзічы. За 12 сутак састаў пераадолеў каля 9 тыс. кіламетраў. Шлях па моры заняў бы амаль у чатыры разы больш часу. У перспектыве на станцыі Калядзічы плануецца стварыць транспартна-лагістычны цэнтр, які дасць магчымасць кансалідаваць тут прадукцыю з Кітая з далейшай адпраўкай у краіны Еўропы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ На слыху



## Украіна адмовілася ад «Еўрабачання»

**Нашы суседзі не будуць удзельнічаць у дзіцячым конкурсе з фінансавых меркаванняў.**

Украіна адмовілася ад удзелу ў міжнародным дзіцячым песенным конкурсе «Еўрабачанне» ў лістападзе бягучага года з-за «крытычнага недафінансавання». Такую заяву зрабіла Нацыянальная грамадская тэлерадыёкампанія краіны.

Як адзначаецца ў афіцыйным паведамленні, «удзел у конкурсе прадугледжвае значныя выдаткі на правядзенне адборачнага этапу, а таксама абавязковы фінансавы ўнёсак у Еўрапейскі вяшчальны саюз», які з'яўляецца заснавальнікам і арганізатарам конкурсу. Сёлета НГТУ ўпершыню не мае магчымасці забяспечыць усе гэтыя выплаты, паколькі атрымала з дзяржбюджэту ўдвая меншую суму, чым прадугледжана адпаведным законам «Аб тэлебачанні і радыёвяшчанні Украіны». Такім чынам, краіна-суседка, якая пастаянна ўдзельнічала ў дзіцячым «Еўрабачанні» з 2006 года, зробіць вымушаную паўзу. Ці распаўсюдзіцца яна і на дарослы конкурс, пакуль невядома.

## Весці дзіцячае «Еўрабачанне» хочуць Ксенія Сітнік, Хелена Мерааі і яшчэ каля 100 чалавек

**Завяршыўся прыём заявак на кастынг вядучых міжнароднага конкурсу.**

У Белтэлерадыёкампанію паступіла каля 100 анкет ад дарослых і дзяцей 9—14 гадоў, якія жадаюць узяць удзел у кастынгу вядучых дзіцячага «Еўрабачання-2018». Дарэчы, сярод ахвотных даволі многа ўжо вопытных артыстаў і тэлевядучых, а таксама ўдзельнікаў конкурсу мінулых гадоў. Так, у лік прэтэндэнтаў увайшлі Ксенія Сітнік, якая першай з беларускіх удзельнікаў выйграла дзіцячае «Еўрабачанне» ў 2005 годзе, Надзея Місякова (удзельніца конкурсу 2014 года), Руслан Асланаў (2015 год) і Хелена Мерааі (2017 год). Таксама даслалі анкеты вядучая дзіцячага «Еўрабачання-2010» Лейла Ісмаілава і фіналісты нацыянальных адбораў дарослага конкурсу Анжаліка Пушнова і Алег Шчуцкі.

Каб пацвердзіць сваю адпаведнасць заяўленым крытэрыям — валоданне англійскай, уменне трымацца на сцэне і працаваць у кадры, вопыт работы ў прамым эфіры і ўдзелу ў тэлевізійных праектах, — ужо ў жніўні кандыдаты пройдуць кастынг непасрэдна ў тэлестудыі. Ацэньваць патэнцыйных вядучых будуць прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі і мальтыйскі шоу-прадзюсар дзіцячага «Еўрабачання-2018» Гордан Банела.

Нагадаем, 16-е па ліку дзіцячае «Еўрабачанне» другі раз у гісторыі прымае Беларусь. Удзел у шоу пацвердзілі 15 краін, прычым Уэльс дэбютуе на гэтым конкурсе, а Францыя вернецца пасля доўгага перапынку. Беларускі прадстаўнік вызначыцца 31 жніўня падчас фінальнага гала-канцэрта нацыянальнага адборачнага этапу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 48

20 ліпеня — Міжнародны дзень шахмат. Віншуем са святам усіх аматараў старажытнай гульні!

* * *

Прапануем задачу магілёўчаніна Валерыя Фрыгіна, 18-разовага чэмпіёна Беларусі па рашэнні шахматных кампазіцый *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Kpd1, Фd7, Лh4, Cd5, Cf4, Ke4 (6).

**Чорныя:** Kpb4 (1).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Як абяцалі ў мінулым выпуску, раскажам пра чэмпіянат свету па бліцы і хуткіх шахматах сярод кадэтаў (хлопчыкаў і дзяўчынак да 8, 10 і 12 гадоў), які другі год запар ладзіўся ў Мінску. За дошкі селі 748 юных шахматыстаў з 27 краін. З 36 медалёў 11 — на рахунку Расіі (2 залатыя), 9 — Узбекістана (5 залатых), 6 — Украіны (2 залатыя) і г. д. У Беларусі — 3 медалі: залаты — Каці Зубкоўскай у бліцы да 8 гадоў, бронзавыя — Арцёма Стрыбука (у хуткіх шахматах) і Міхаіла Спіжарнага (у бліцы) да 12 гадоў.

* * *

Прывядзем яшчэ дзве партыі з нядаўняга Мемарыялу В. Купрэйчыка ў Мінску.

Максім Царук — Юрый Ціханаў. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. f3 e5 6. Kb3 Ce7 7. c4 a5 8. Ce3 Kc6 9. Ce2 0-0 10. 0-0 Ce6 11. Kc3 Kd7 12. Kd5 a4 13. Kd2 Cg5 14. Cf2 C:d5 15. ed Kb4 16. Ke4 Ce7 17. a3 Ka6 18. Ф:a4 f5 19. Kc3 Ch4 20. g3 Cf6 21. Фc2 Лc8 22. Ф:f5 e4 23. K:e4 Ce5 24. Фe6+ Kph8 25. K:d6 Kc7 26. Kf7+ Л:f7 27. Ф:f7 Ke8 28. f4 Cf6 29. Cg4 Лc7 30. Cb6, 1:0.

Уладзіслаў Каташук — Яна Ільючык. 1. d4 Kf6 2. c4 d6 3. Kc3 Kbd7 4. e4 e5 5. Kge2 g6 6. h3 Cg7 7. Ce3 0-0 8. d5 Kc5 9. Фc2 a5 10. g4 Ke8 11. Kg3 Cf6 12. 0-0-0 Cg5 13. Cd3 C:e3+ 14. fe Kg7 15. Фg2 Фg5 16. Kpd2 K:d3 17. Kp:d3 h5 18. Kb5 Cd7 19. gh K:h5 20. Лdg1 K:g3 21. Фh2 C:b5 22. cb Фd8 23.Л:g3 Kpg7 24. h4 a4 25. h5 Лh8 26. Фg2 Фe8 27. hg Ф:b5+ 28. Kpc2 Фc4+ 29. Kpb1 Фd3+ 30. Kpa1 f6 31. Лh7+ Kpf8 32. g7+, 1:0.

* * *

У Мінску адбыўся трэці міжнародны турнір аматараў (з 96 удзельнікаў ніхто не меў звання гросмайстра сярод мужчын): 1. Звіад Січынава (Расія); 2. Артур Гарагазян (Арменія); 3. Руслан Яндарбіеў (Расія). З беларусаў найлепшыя Валянцін Ежаль (11-е месца) і Дзмітрый Навіцкі (12-е). У бліцы (46 гульцоў) прызёрамі сталі Яўген Ермалаеў (Расія), Віктар Янаў (Украіна) і Максім Царук (Беларусь).

У Магілёве прайшоў XVIII дзіцячы турнір на прызы гросмайстра А. Фёдарава (127 удзельнікаў з Беларусі і Расіі): у катэгорыі 2003—2005 г. н. прызавую тройку склалі Ксенія Зелянцова, Максім Царук і Арцём Стрыбук, 2006 г. н., і маладзейшыя — Міхаіл Спіжарны, Ягор Сіліч і Максім Кубацін.

На Кубку Балтыі ў Палангэ Арсень Котаў — другі з 67, а Ягор Сіліч — пяты. Рахіль Эйдэльсон заняла трэцяе месца ў Чалябінску, Мікіта Маёраў быў пяты са 131 у Варонежы, Аляксей Аляксандраў — восьмы са 153 у Астане. У Ерэване (72 удзельнікі) Кірыл Ступак і Андрэй Жыгалка занялі адпаведна 12-е і 20-е месцы. У ЗША Андрэй Гаравец быў трэці ў Шарлоце і адзінаццаты з 65 у Лас-Вегасе. Раман Лейнаў фінішаваў другі ў Чарнігаве. У Польшчы Сцяпан Давыдзюк быў пяты ў Сарнаках, Аляксандр Смірноў і Сяргей Хаміцкі — адпаведна першы і трэці ў Сакулы.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фe7. Першыя правільна адказалі Аляксандр Смерыч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Кананові́ч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Сядзі і глядзі

## ШТО ХАВАЕЦЦА ЗА ЛІЧБАМІ



### «8 МІЛЯ», TV1000, 23 ліпеня

1995-ты, Дэтройт. Горад, які быў сэрцам амерыканскага аўтапрама, ператвараецца ў магілу прамысловасці, цэнтр беспрацоўя і хаосу, а таксама аднаго з самых сур'ёзных у гісторыі ЗША канфліктаў паміж белым і каляровым насельніцтвам. Шаша 8-я міля, якая падзяляе Дэтройт і прыгарад, становіцца своеасаблівай лініяй дэмаркацыі паміж чорнымі і белымі. Але ёсць і тыя, хто разумее, што сітуацыю трэба мяняць, пакуль не позна. Малады рэпер Джымі па мянушцы Трус праз музыку спрабуе вырвацца з атмасферы агульнай нянавісці, дакрычацца па абодва бакі барыкад, а таксама змяніць да лепшага ўласнае жыццё.

Фільм стаў культавым у субкультуры хіп-хопа дзякуючы ўдзелу рэпера Эмінема, а сам выканаўца і акцёр атрымаў-такі «Оскар» за найлепшую песню.



### «2 ДНІ», TV1000 Ru, 23 і 24 ліпеня

У глыбокай правінцыі за сотні кіламетраў ад Масквы знаходзіцца музей напаўзабытага класіка рускай літаратуры. На зямлю, дзе размешчаны маёнтак, прэтэндуе губернатар, які хоча збудаваць тут новую рэзідэнцыю. А каб пацвердзіць свае прэтэнзіі законным шляхам, запрашае з Масквы высокага чыноўніка ўзроўню намесніка міністра.

Але чыноўнік з першага погляду закахаўся ў намесніка дырэктара музея, літаратуразнаўцу Марыю, якая не баіцца ў твар гаварыць праўду пра карупцыю і сквапнасць мясцовай улады. Масквіч вырашае дапамагчы наіўным інтэлігентам захаваць музей — праўда, для гэтага давядзецца задзейнічаць усе магчымыя сувязі...



### «ДЗЕСЯЦЬ НЕГРЫЦЯНЯТ»

**«Беларусь 3», 28 і 29 ліпеня**

Што можа быць страшнага ў дзіцячай лічылцы? Напрыклад, тое, што яна раптам ператвараецца ў жыццё. Хтосьці невядомы, сабраўшы на аддаленым Негрыцянскім востраве 10 зусім розных чалавек, абвяшчае ўсім прысуд за здзейсненыя ў мінулым злачынствы і пачынае няўхільна скарачаць іх колькасць у поўнай адпаведнасці з радкамі лічылачкі...

Савецкая экранізацыя знакамітага дэтэктыва Агаты Крысці, у адрозненне ад папярэдніх брытанскіх і амерыканскіх стужак, найбольш поўна перадае атмасферу кнігі: змрочную, песімістычную, поўную ўзаемнага недаверу і падазрэнняў. Акрамя таго, рэжысёру Станіславу Гаварухіну ўдалося сабраць выдатны акцёрскі ансамбль, а здымкі праходзілі каля знакамітага «Ластаўчынага гнязда» і ў інтэр'ерах Варанцоўскага палаца ў Крыме.




## З куркоўкай на ка́ню

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**по́куць** — кут у хаце, дзе вісяць абразы;

**каня́** — драпежная птушка;

**укле́нчыць** — стаць на калена;

**зале́ць** — мерзнуць, стыць;

**курко́ўка** — паляўнічая стрэльба;

**капы́л** — калодка для вырабу абутку.

**На ўсю іванаўскую** — вельмі моцна, гучна крычаць, плакаць. Беларусы яшчэ скажуць: *на ўсе застаўкі, не сваім голасам.* Руския: *благим матом, во всю глотку.*

**Танцаваць пад нечыю дудку** — ва ўсім падпарадкоўвацца каму-небудзь, выконваць чыю-небудзь волю. Беларускія адпаведнікі: *скакаць пад дудку, хадзіць па нітачцы.* Руския: *ходить на пальчиках, ходить по струнке.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Тэлесеткі

## ПЕРАМАГЧЫ СЯБЕ НА «СЦЕЖЦЫ МУЖНАСЦІ»

Вядучыя тэлеканала «Беларусь 2» узялі ўдзел у пешым комплексным марафоне «Сцежка мужнасці — лета 2018», які прайшоў на Лагойшчыне. Тэлевізійная каманда пераадолела выбраную дыстанцыю ў 30 кіламетраў і ў поўным складзе дайшла да фінішу.

Марафон, зладжаны сумесна СГА «Адраджэнне», упраўленнем спорту і турызму Мінгарвыканкама і Мінспорту, адбыўся сёлета ўжо чацвёрты раз. Яго ўдзельнікі, у залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі і ўпэўненасці ў сабе, выбіралі дыстанцыю ў 30, 70 або 100 кіламетраў па ўмерана перасечанай лясной мясцовасці і пераадольвалі яе — самастойна, у тандэме ці групай з пяці чалавек. Адметнасць і складанасць маршруту была ў тым, што ўсе спартсмены заходзіліся на поўным самазабеспячэнні і маглі разлічваць толькі на ўласныя турыстычныя навыкі і прылады ды на тычкі, якімі арганізатары абазначылі сцежкі, каб ніхто не збіўся са шляху.

**Аукцион состоится 21 августа 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403, с 23 июля по 15 августа 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении электронных торгов по продаже движимого имущества

**Организатор электронных торгов (продавец):** Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Белорусский государственный институт стандартизации и сертификации», г. Минск, ул. Мележа, д. 3, ком. 406, тел.: 8 (017) 269 68 77, 269 69 99.

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by.

**Дата проведения электронных торгов:** 27 августа 2018 г.

**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество».

**Лот № 1.**

Автомобиль ГАЗ 2705-434.

**Характеристика предмета торгов:** грузопассажирский вагон ГАЗ 2705-434, год выпуска – 2006, пробег 197 244 км, объем двигателя 2 400 куб. см, бензин, кузов (VIN) № X9627050060505509.

**Начальная цена предмета электронных торгов с НДС:** 1 115,60 **бел. руб.**

**Размер задатка – 200,00 бел. руб.**

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие** в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – 21 августа 2018 года, 15.00.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа», утвержденным протоколом заседания Правления ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, а также затраты на оказание услуг по независимой оценке движимого имущества. После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями электронных торгов продавцом заключается договор купли-продажи движимого имущества

КАМЕНТАРЫЙ
ДА ТЭМЫ

**Мечыслаў ГОЙ, старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта:**

— Сёння турызм і бязвізавы ўезд з'яўляюцца своеасаблівай візітнай карткай Гродна. Сёлета горад ужо наведала больш за 35 тысяч замежных турыстаў з 50 краін свету. І гэта, безумоўна, не канчатковая лічба. Усе гарадскія службы і арганізацыі працуюць над тым, каб замежнікам у Гродне было камфортна. Значны ўклад у развіццё турыстычнай інфраструктуры ўносіцца дзякуючы прыватнай ініцыятыве. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў сферы грамадскага харчавання і пражывання. Летась адкрыліся тры аб'екты пражывання. Сёлета яшчэ два: апарт-гатэль «Славія» і хостэл Kip Town. Да канца 2018 года павінны адкрыцца яшчэ тры хостэлы і дзве гасцініцы ў гістарычнай частцы горада.



Таксама бязвіз падштурхнуў да стварэння сучасных аб'ектаў грамадскага харчавання цікавых фарматаў, якія прапануюць новыя віды паслуг і разнастайныя па архітэктурна-тэхнічным стане. Сёлета сетка пашырылася за кошт адкрыцця 12 аб'ектаў грамадскага харчавання, разлічаных на 451 месца. Адзначу, што ўсе яны знаходзяцца ў цэнтры горада: гэта бар «Мята Lounge», бар «Свабода», міні-кафэ «Сустрэчы» (на базе тралейбуса) ды іншыя. Таксама павялічылася зона абслугоўвання спажыўцоў у рэстаране хуткага абслугоўвання «Вялікі буфет», а ў хуткім часе на даху гандлёвага дома «Нёман» адкрыецца летняе кафэ-тэраса.

Каб турыстам было што ўспамінаць дома пасля вяртання, мы адкрылі гандлёвы павільён «Сувенірная крама». У цэнтральнай частцы горада ёсць крамы айчынных вытворцаў, у тым ліку шклозавода «Нёман», «Элемы», «Мілавіцы» ды іншых. У Гродне ёсць 41 гандлёвы аб'ект, далучаны да сістэмы TaxFree.

Акрамя таго, удасканальваем сістэму навігацыі і маршрутнага арыентавання турыстаў. У горадзе ўжо з'явіліся чатыры інфармацыйныя стэнды з картамі. Сёлета да 1 верасня з'явіцца яшчэ дзевяць такіх жа «навігатараў». У чэрвені адкрылася назіральная пляцоўка над Нёманам, абсталяваны два прычалы ў цэнтры горада для маламерных суднаў і цеплахода. Цяпер кожны ахвотны можа скарыстацца паслугамі рачнога таксі.

Многае робіцца для развіцця велатурызму і веласпеднага руху. Напрыклад, паніжаем бардзюрны камень, робім спецыяльную разметку, а таксама будуем новыя веладарожкі. Веласіпедныя маршруты па горадзе дадуць магчымасць актыўнаму турысту пазнаёміцца з гісторыяй старых вуліц і прыгажосцю сучаснага Гродна.

Мы будзем працягваць развіваць вытворчы турызм. Экскурсіі з дэгустацыяй ужо праводзяцца на ААТ «Малочны свет». Хацелася б, каб такіх прадпрыемстваў станавілася ўсё больш. Экскурсіі на прамысловыя прадпрыемствы дапаўняюць і пашыраюць уяўленне пра горад.

Турызм павінен і можа прыносіць прыбытак, а мы, са свайго боку, будзем рабіць усё для таго, каб кожны, хто наведае Гродна, захацеў вярнуцца сюды яшчэ не адзін раз.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

СВАЯ СПРАВА ПА БЯЗВІЗЕ

# БАГЕМА Ў СТАРЫМ КВАРТАЛЕ

## Як знакаміты ўраджэнец Гродна натхніў сваіх землякоў на стварэнне сямейнага бізнесу

**Бязвіз зрабіў значны ўнёсак у развіццё абласнога цэнтра і падштурхнуў прадпрымальнікаў да адкрыцця новых кавярняў, рэстаранаў, гасцініц, атэль-апартаментаў і хостэлаў. Створана 400 рабочых месцаў. Толькі за першы квартал бягучага года адкрыта некалькі аб'ектаў харчавання. Плануюць развіваць гэты напрамак і гаспадары новага рэстарана «Бакст». Свой першы аб'ект Ігар і Аксана ГУЛІЕВЫ назвалі ў гонар Леона Бакста, які нарадзіўся ў Гродне ў другой палове XIX стагоддзя і стаў сусветна вядомым мадэльерам і дэкаратарам.**




### З велічу і густам

Бакст быў знакамітым дызайнерам інтэр'ераў. Таму некаторыя яго рашэнні ўдала ўпісаліся і ў афармленне сучаснай залы. На столі — некалькі прынтаў вядомага мастака, а на сцяне — сцэнічны вобраз Шэхеразады, створаны па малюнку Бакста. Дарэчы, яго работа над тэатральнымі дэкарацыямі зрабіла вялікі фурор з-за яскравага ўсходняга арнаменту і нацыянальнага каларыту. Яго ўзоры з тэатральнай сцэны пераходзілі ў жыццё. Вось і зараз у вочы кідаюцца дзве свяцільні каля канапы з мудрагелістымі яскравымі ўзорамі. Яны таксама выкананы на падставе дызайнерскіх работ Бакста.

— У нас багаты турыстычны патэнцыял, і яго трэба як мага шырэй паказваць, — тлумачыць Аксана. — Леон Бакст — наш вядомы зямляк, ён нарадзіўся ў Гродне, магчыма, у гэтым старым квартале, дзе мы адкрылі рэстаран і назвалі яго імем.

І сапраўды, вуліца Замкавая лічылася яўрэйскім паселішчам. Непадалёку знаходзіцца і самая прыгожая ў Еўропе харальная сінагога, гісторыя якой бярэ пачатак у XVI стагоддзі. Леон Бакст нарадзіўся ў артадаксальнай яўрэйскай сям'і ў 1866 годзе і, напэўна, наведваў яе. У Гродне ён скончыў гімназію, але далейшы яго лёс звязаны ў асноўным з Санкт-Пецярбургам і Парыжам. Для ўдзелу ў выстаўцы Леон узяў і скараціў прозвішча дзеда. У Гродне пра знакамітага земляка пакуль мала хто ведае, хоць ён лічыцца настаўнікам Марка Шагала, быў зяцем вядомага мецэната Паўла Траццякова і саратнікам антрэпрэнёра Сяргея Дзягілева. Не так даўно адну з вуліц новага мікрараёна назвалі яго імем. Свой унёсак у вяртанне гістарычнай культурнай спадчыны вырашылі зрабіць і прадстаўнікі малога бізнесу. І даволі паспяхова, бо турыстычныя фірмы нават сталі вадзіць да іх экскурсіі.

— Да нас многія прыходзяць проста на экскурсію, — заўважае Аксана. — Пытаюцца, хто такі Бакст. Нам гэта вельмі прыемна, бо мы таксама ганарымся сваім земляком, які адзяваў у свае капелюшы і пальчаткі ўвесь Парыж. Потым з'ехаў у ЗША, стварыў прынты, узоры якіх і зараз лічацца моднымі. Мы з самага пачатку ўзялі гэтую канцэпцыю, пастараліся стварыць нешта такое, чаго пакуль не было, але што з'яўляецца часткай гісторыі Гродна.

### Мелодыі яўрэйскага квартала

Сам будынак таксама з ліку старых пабудоў. Доўгі час ён пуставаў, але ў рэшце рэшт гарадскім уладам удалося прадаць яго. Новы ўласнік правёў рэканструкцыю, аднавіў фасад. Аксана і Ігар палічылі, што тут можна стварыць утульны куток для адпачынку. І роўна год таму на ўмовах доўгатэрміновай арэнды адкрылі тут свой рэстаран.

— Мы прадставілі бізнес-праект як стартап для атрымання льготнага крэдыту, частка сродкаў была свая. Адразу ўзяліся за аднаўленне памяшкання, бо тут былі толькі сцены. Мы імкнуліся хутчэй завяршыць работы і за восем месяцаў усе зрабілі. Гарадскія ўлады таксама ішлі насустрач, бо наша ўстанова дала гораду яшчэ каля 30 новых рабочых месцаў, — адзначыла Аксана Гуліева.

**❍ У ТЭМУ**

За перыяд дзеяння бязвізавай зоны ў Гродне і наваколлі створана больш за 300 рабочых месцаў у сферы гандлю, 64 — у сферы грамадскага харчавання, каля 50 у галіне культуры і адпачынку. Увядзенне бязвізавага рэжыму значна актывізавала малы бізнес. Адкрыта 10 аб'ектаў грамадскага харчавання на 360 месцаў, каля 120 гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання працуе ў летні перыяд.




Ігар і Аксана ГУЛІЕВЫ.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Гаспадыня не тоіць, што стаўку рабілі і на бязвізавы рэжым. Сюды часта наведваюцца замежныя дэлегацыі, заходзяць турысты з Ізраіля, ЗША, Польшчы, Германіі... Гэтае месца абралі для адпачынку і многія гродзенцы. Яно крыху багемнае, бо тут няма звыклага шумнага рэстараннага ўкладу, а ёсць настрой на душэўныя сустрэчы ці дзелавыя перагаворы. Знайшлося нямала скептыкаў, якія папярэджвалі, што такім чынам немагчыма ўтрымаць падобны бізнес, але навічкі-рэстаратары сваю лінію ўпарта трымаюць.

### Смаката ў стылі Бакста і кадравы голад

Аксана ўпэўнена, што яны абралі правільны кірунак — спакойная музыка, добры сэрвіс, арыгінальная кухня... Дарэчы, колькі слоў пра стравы. Аказваецца, большую палову выручкі складае менавіта даход ад продажу ежы, бо наведвальнікі больш любяць смачна паесці, чым выпіць.

Па-першае, тут ганарацца, што трапілі ў лік пераможцаў фестывалю-конкурсу «Гастрафэст Гродна». Па-другое, стараюцца ўкараніць сучасныя тэхналогіі з элементамі малекулярнай кухні. Так завецца імправізацыя, якая дазваляе злучаць супрацьлеглыя субстанцыі. Напрыклад, у звычайным тамаце можа быць дэсерт. Дзякуючы сучасным тэхналогіям, бісквіт і шакалад пераўтвараюцца ў каляровы гаршчочак, які не адрозніць ад сапраўднага. Таксама свайго роду дызайнерска-мастацкі падыход, якім карыстаўся і вялікі Бакст у сваёй творчасці...

Шэф-повар, вядома, з фантазіяй, але майстэрства не прыходзіць адразу. Гэтаму спрыяе падрыхтоўка ў беларускіх і замежных рэстаратараў. Наогул, з кадравым патэнцыялам ёсць праблемы. І гэта бяда не толькі малога бізнесу, але і ўвогуле рынку працы. Не хапае кваліфікаваных спецыялістаў, пры тым што ў Гродне повараў-кандытараў і барменаў рыхтуюць у некалькіх каледжах. Па словах Аксаны, далёка не ўсе маюць уяўленне аб сучасных тэхналогіях у гастранамічнай сферы, многія не знаёмыя з такімі працэсамі, як вакуумацыя ці шокавая замарозка. Таму прыходзіцца вучыць на месцы, каб стварыць каманду прафесіяналаў. У гэтым рэстаратары бачаць сваю галоўную задачу.

### У малога бізнесу вялікія планы

Зараз умовы для работы спрыяльныя, лічаць бізнесмены. Гэта датычыцца як дакументацыі, так і колькасці праверак. Іх амаль што няма. За выкананнем стандартаў сочаць самі ўласнікі, гэта ў іх інтарэсах. Гарадскія ўлады гатовыя падтрымаць захады прадпрымальнікаў. Спрыяльныя ўмовы падштурхнулі Гуліевых да стварэння яшчэ аднаго малога прадпрыемства, таксама ў сферы грамадскага харчавання, праўда, крыху іншага фармату.

Будзе працягвацца работа па добраўпарадкаванні існуючага аб'екта. У будучыні фасад будынка набудзе яшчэ больш характэрныя рысы, звязаныя з фігурай Бакста. Ёсць у рэстаратараў і планы наконт навакольнай тэрыторыі. На адной з пляцовак ёсць намер стварыць міні-парк, прыгожую зону адпачынку з архітэктурнымі формамі, дзе будзе цікава і дарослым, і дзецям. Унутраны дворык падыходзіць для культурных мерапрыемстваў. Бізнесмены апантаны ідэяй арганізаваць тут традыцыйныя фэсты з выступленнем джазавых калектываў, моднымі паказамі, вернісажамі... Вядома, гэта будуць мерапрыемствы ў гонар Леона Бакста.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КУДЫ ПАДАЦЦА, КАБ УЛАДКАВАЦЦА?

## Як у Барысаве вырашаюць пытанні занятасці насельніцтва

**Паводле інфармацыі Белстата, на канец мая Барысаўскі раён па колькасці беспрацоўных займаў другое месца ў Мінскай вобласці пасля Салігорскага раёна. Карэспандэнт «Звязды» выехала на месца і ўпэўнілася, што сітуацыя мяняецца да лепшага. Па стане на 1 ліпеня 2018 года на ўліку беспрацоўных стаяла 442 чалавекі, што на траціну менш, чым за аналагічны леташні перыяд.**

### НЕКРЫТЫЧНЫ ДЫСБАЛАНС

У раёне больш як 75 тысяч эканамічна актыўнага насельніцтва — практычна 70 % ад агульнай колькасці жыхароў Барысаўшчыны. За пяць месяцаў гэтага года ў сферы прамысловасці працавала 21 тысяча чалавек. Можна сказаць — чацвёртая частка ад усіх занятых у эканоміцы. Прамысловасць — флагман, на які ў раёне робяць асаблівую стаўку і ўдзяляюць шмат увагі ўліку, кантролю ў пытаннях працоўнай занятасці.

— Барысаўскі раён — адзін з буйных індустрыяльных раёнаў не толькі ў Мінскай вобласці, але і ў Беларусі. Таму, канешне, не абыходзіцца і без праблем. За студзень — май колькасць звольненых крыху перавышае колькасць прынятых на работу. Аднак пры больш паглыбленым аналізе высветлілася, што дысбаланс не крытычны: 30 % — гэта жанчыны, якія пайшлі ў дэкрэтны водпуск, больш як 30 % работнікаў пайшлі на пенсію. Акрамя таго, людзі вельмі актыўна карыстаюцца нормамі Указа Прэзідэнта № 345 па адкрыцці свайго бізнесу ў сельскіх населеных пунктах. З моманту пачатку дзеяння дакумента тут створана каля 40 прадпрыемстваў, — расказала **намеснік старшыні Барысаўскага райвыканкама Ліяна ХМУРОВІЧ.** — Разам з тым мы актыўна працуем па папулярызацыі самазанятасці насельніцтва. У сувязі з нормамі дзеяння Указа Прэзідэнта многія грамадзяне займаюцца рамесніцкай дзейнасцю, аказваюць менавіта тыя паслугі, якія не патрабуюць рэгістрацыі. Для людзей гэта выгадна, паколькі яны працуюць па спрошчаным падатку, самі на сябе, зарабляюць, каб у дастатку ўтрымліваць сям'ю. Таму, паўтаруся, мы не бачым ніякай крытычнасці ў разбежцы паміж прынятымі і звольненымі работнікамі.

Нельга не ўлічваць і тое, што ў раёне шмат сезонных работнікаў, асабліва ў сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Яны працуюць у кацельных качагарамі падчас ацяпляльнага сезона, а на лета звальняюцца. Але лічацца ў штаце.

— У многіх ёсць крэдыты, фінансавыя абавязацельствы. Таму мы вельмі акуратна падыходзім да гэтага пытання. Калі ў чалавека ў працоўнай кніжцы стаіць запіс з асноўнага месца работы, ён адчувае сябе больш упэўнена і камфортна. Мы добра ведаем, чым займаюцца сезоннікі: збіраюць грыбы, ягады, вырошчваюць сельгаспрадукцыю на прысядзібных участках, займаюцца падрацоўкамі. А значыць, плацяць падаткі з выручкі, — сцвярджае мая суразмоўніца.

### ШУКАЮЦЬ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ «ДЖЫЛІ»

У сувязі з адкрыццём другой чаргі завода СЗАТ «БелДжы» па вытворчасці аўтамабіляў «Джылі» ў раёне з'явіўся нават дэфіцыт рабочай сілы. Калі вырашалася пытанне з уводзенем другой змены, спатрэбіцца яшчэ 600 чалавек, а ў далейшым тут гатовы прыняць каля 1,5 тысячы работнікаў. Таму прадпрыемства звярнулася па дапамогу да мясцовых улад.

— Па кожным чалавеку мы вядзём строгі ўлік. Бачым, хто ідзе на пенсію, хто звальняецца па сямейных абставінах, для догляду інваліда, на іншае месца працы. Усе звальненні адбываюцца толькі па ўзгадненні з намеснікам старшыні райвыканкама, які курыруе адпаведную сферу. Мы выклікаем людзей да сябе і прапануем новыя рабочыя месцы, умовы працы, — канстатуе Ліяна Хмуровіч.

— Сапраўды, у гэтым кірунку мы цесна супрацоўнічаем з райвыканкамам. Калі ідзе адток рабочай сілы з нейкага прадпрыемства, то мы гатовы ўзяць спецыялістаў да сябе. У нас распрацавана праграма падрыхтоўкі кадраў, паколькі новы завод, новыя тэхналогіі. У любым выпадку на рабочым месцы неабходна праходзіць стажыроўку. Навучанне працягваецца ад двух да шасці месяцаў. Пасля праходжання курса навічкам прысвойваецца трэці разрад, яны становяцца паўнавартаснымі спецыялістамі, — уступае ў размову **начальнік аддзела кадраў і сацыяльнага развіцця завода «БелДжы» Вольга АНДРОНАВА.**

Дадам, што на прадпрыемстве распрацавана таксама сумесная праграма з усімі навучальнымі ўстановамі рэгіёна, паводле якой навучэнцы каледжаў, ліцэяў на апошнім курсе будуць атрымліваць дадаткова да выбранай яшчэ адну-дзве спецыяльнасці. Напрыклад, маляроў па афарбоўцы аўтамабіляў. Гэтай прафесіі, як і некаторым іншым, у Беларусі не вучаць. Таму Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падняло пытанне па рэалізацыі праекта падрыхтоўкі па новых прафесіях непасрэдна ў Барысаўскім раёне.

На «БелДжы» прыцягваюць работнікаў усіх катэгорый, інжынерна-тэхнічны персанал з Мінска, суседніх Смалявіч, Жодзіна. Для дастаўкі людзей набылі свой транспарт. Цяпер са сталіцы ездзяць 56 чалавек. На завод прыйшлі 18 маладых спецыялістаў па размеркаванні.

— На момант стажыроўкі вучням штомесяц выплачваюць зарплату 545 рублёў, — канстатуе Ліяна Леанідаўна. — Гэта своеасаблівы ўрок кіраўнікам прадпрыемстваў, якія не змаглі ўтрымаць кадры. І нам са службай занятасці трэба працаваць вельмі мэтанакіравана, дакладна, кропкава з усімі, паколькі ў раёне амаль сем тысяч юрыдычных асоб розных форм уласнасці. І тут неабходна захаваць працоўныя калектывы.

### ПРАПАНОЎ БОЛЬШ, ЧЫМ ЛЮДЗЕЙ

У той жа час варта адзначыць і пазітыўную дынаміку па колькасці вакансій, якія сталі прапаноўваць наймальнікі рэгіёна ў цэнтр занятасці. На 1 ліпеня было 1154 заяўкі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Прапаноў больш, чым патэнцыйных работнікаў, якія могуць быць працаўладкаваныя. У мінулым годзе была крыху складанейшая сітуацыя: конкурс тры чалавекі на месца. Цяпер у нас стабільная сітуацыя, вядзецца актыўная работа па навучанні грамадзян, зарэгістраваных у якасці беспрацоўных. Напрыклад, за шэсць месяцаў прайшлі курсы 79 грамадзян, — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Наталля ЖУГА.**

У службе занятасці беспрацоўным прапаноўваюць таксама прыняць удзел у грамадскіх работах. У асноўным рабочыя рукі патрэбныя ў сельгасарганізацыях. За шэсць месяцаў гэтага года ў карыснай грамадскай справе прыняло ўдзел 596 чалавек. Гаспадаркі заключаюць дагаворы з упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва. Усіх ахвотных накіроўваюць у сельгасарганізацыі, дзе яны працуюць у полі, на ферме і атрымліваюць, як правіла, натуральны разлік.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

### Каментарый да тэмы

— Па пытаннях працаўладкавання грамадзян мы працуем у цесным кантакце з раённым выканаўчым камітэтам, раённым упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, сельвыканкамамі. Рашэннем райвыканкама створана пастаянная камісія па садзейнічанні занятасці насельніцтва, — дадае **старшыня Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў Пётр НАВІЦКІ.** — Мы наведваем сельсаветы, выяўляем людзей, якія не працуюць. З дванаццаці сельсаветаў раёна ўжо пабывалі ў палове. На днях правялі сустрэчы ў Вяліцкім і Мётчанскім сельсаветах. На іх прыйшлі 17 чалавек, якія маюць патрэбу ў рабоце. Літаральна ўчора аналагічны сход арганізавалі ў Маісееўшчынскім сельсавеце. Усяго ж у сельскай мясцовасці выявілі 600 незанятых грамадзян.

Як паказваюць мерапрыемствы такога кшталту, людзі хочуць працаваць там, дзе жывуць, непадалёк ад дома. Члены камісіі прапаноўваюць тыя вакансіі, якія ёсць у сельгасарганізацыях, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета. Як правіла, гаспадаркам патрабуюцца механізатары, даяркі, жывёлаводы. Тым, каму з нейкіх прычын не падыходзяць прапанаваныя спецыяльнасці, раім звярнуцца ў службу занятасці насельніцтва для перанавучання.

УТВЕРЖДЕНО
Решением директора
Общества с дополнительной ответственностью
«НП-Сервис»
(Приказ от 26.06.2018 года № 113-ОД)

**ИЗМЕНЕНИЯ
в РЕШЕНИЕ
о сорок первом выпуске облигаций
Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис»**

1. Пункт 4. «Наименование депозитария, обслуживающего Эмитента» Решения о сорок первом выпуске облигаций Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (далее – Решение о выпуске Облигаций), утвержденного решением директора Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (далее – Эмитент) 27 сентября 2017 г. (Приказ №188/1 – ОД от 27.09.2017), изменить, изложив в следующей редакции:

«Депозитарий Эмитента – Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ «Беларусбанк»), код депозитария 005, расположен по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского,18.

ОАО «АСБ «Беларусбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, регистрационный номер 56.

Специальное разрешение (лицензия) №02200/5200-1246-1089 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам выдано Министерством финансов Республики Беларусь 10.04.1996.»

2. Пункт 5. «Документ, регулирующий хозяйственную деятельность Эмитента» Решения о выпуске Облигаций изменить, изложив в следующей редакции:

«Документом, регулирующим хозяйственную деятельность Эмитента, является Устав общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (новая редакция), зарегистрированный Минским городским исполнительным комитетом 25 мая 2016 г., регистрационный № 100080849 (с учетом изменений, зарегистрированных Минским городским исполнительным комитетом 25 июля 2016 г., 11 октября 2016 г., 20 октября 2016 г., 23 декабря 2016 г., 30 января 2017 г., 20 июля 2017 г., 25 января 2018 г.).»

3. Пункт 13. «Место и время проведения открытой продажи облигаций» Решения о выпуске Облигаций изменить, изложив в следующей редакции:

«Открытая продажа Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Организатор торговли) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами Организатора торговли.

Время проведения открытой продажи Облигаций – в соответствии с регламентом торгов Организатора торговли.

Покупатели осуществляют приобретение Облигаций в соответствии с законодательством Республики Беларусь с использованием услуг профессиональных участников рынка ценных бумаг – членов секции фондового рынка Организатора торговли (далее – профучастники). Список профучастников размещен на официальном интернет-сайте Министерства финансов Республики Беларусь по адресу: http://www.minfin.gov.by/ru/securities_department/licensing/ (раздел «Реестр профучастников рынка ценных бумаг»).»

4. В подпункте 24.1. пункта 24 «Условия и порядок приобретения Облигаций Эмитентом до даты начала их погашения» Решения о выпуске Облигаций слова «(за исключением владельцев Облигаций, обратившихся за досрочным выкупом Облигаций к Уполномоченному брокеру)» исключить.

5. В тексте Решения о выпуске Облигаций слова «Уполномоченный брокер» заменить на слово «профучастник».

Остальные пункты Решения о выпуске Облигаций остаются неизменными.

Директор ОДО «НП-Сервис» Д. Б. Борисенок

Директор ООО «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

УНП 100080849

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательным советом
Закрытого акционерного общества
«Универсам «Центральный»
(Протокол от 27.06.2018 года № 8)

**ИЗМЕНЕНИЯ
в ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ
четвертого выпуска
Закрытого акционерного общества
«Универсам «Центральный» (ЗАО «Универсам «Центральный»)**

1. Часть первую подпункта 1.10.1. пункта 1.10. «Органы управления и контроля Эмитента, их численный состав, полномочия» Проспекта эмиссии облигаций четвертого выпуска Закрытого акционерного общества «Универсам «Центральный» (далее – Проспект эмиссии), утвержденного Наблюдательным советом Закрытого акционерного общества «Универсам «Центральный» (далее – Эмитент) 17.08.2017 (Протокол № 8 от 17.08.2017), изменить, изложив в следующей редакции:

«Высшим органом управления Эмитента является Общее собрание акционеров Эмитента. Количество акционеров – 146 (на 07.03.2018).»

2. Часть вторую подпункта 1.10.2. пункта 1.10. «Органы управления и контроля Эмитента, их численный состав, полномочия» Проспекта эмиссии изменить, изложив в следующей редакции:

«Количественный состав Наблюдательного совета составляет 2 (Два) человека.»

3. Пункт 1.11. «Сведения о членах Наблюдательного совета Эмитента» Проспекта эмиссии изменить, изложив в следующей редакции:

«1.11.1. Вечер Вячеслав Сергеевич, 1983 г. р. – член Наблюдательного совета.

Занимаемая должность в настоящее время – заместитель директора по развитию ООО «Надежное Управление Ритейлом».

Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.

1.11.2. Скомская Людмила Михайловна, 1979 г. р. – член Наблюдательного совета.

Занимаемая должность в настоящее время – заместитель директора по финансовым вопросам ООО «Надежное Управление Ритейлом».

Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.»

4. Пункт 1.13. «Сведения о контрольном органе Эмитента» Проспекта эмиссии изменить, изложив в следующей редакции:

«Изумрудова Юлия Александровна, 1986 г. р. – ревизор Эмитента.

Занимаемая должность в настоящее время – заместитель главного бухгалтера ООО «Эккаунт Проф».

Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.»

5. Пункт 1.17. «Сведения о собственнике имущества (учредителях, участниках) Эмитента, включающие его (их) персональные данные» Проспекта эмиссии изменить, изложив в следующей редакции:

«Сведения по состоянию на 07.03.2018 г:

| Акционеры | Количество простых (обыкновенных) акций, шт. | Размер доли в уставном фонде Эмитента,% |
|---|---|---|
| Юридические лица, в т. ч.: | 173 003 | 57,6677 |
| – Building Point – F.Z.C. (Билдинг Поинт Ф.З.Ц.), регистрационный номер: 18641, место нахождения: а/я 932, эмират Аджман, Объединенные Арабские Эмираты | 173 003 | 57,6677 |
| Физические лица (145 акционеров) | 126 997 | 42,3323» |

6. Пункт 2.7. «Место и время проведения открытой продажи облигаций» Проспекта эмиссии изменить, изложив в следующей редакции:

«Открытая продажа Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Организатор торговли) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами Организатора торговли.

7. Время проведения открытой продажи Облигаций – в соответствии с регламентом торгов Организатора торговли.

Покупатели осуществляют приобретение Облигаций в соответствии с законодательством Республики Беларусь с использованием услуг профессиональных участников рынка ценных бумаг – членов секции фондового рынка Организатора торговли (далее – профучастники). Список профучастников размещен на официальном интернет-сайте Министерства финансов Республики Беларусь по адресу: http://www.minfin.gov.by/ru/securities_department/licensing/ (раздел «Реестр профучастников рынка ценных бумаг»)».

В подпункте 2.17.2. пункта 2.17. «Условия и порядок приобретения облигаций Эмитентом до даты начала их погашения» Проспекта эмиссии слова «(за исключением владельцев Облигаций, обратившихся за досрочным выкупом Облигаций к Уполномоченному брокеру)» исключить.

8. В тексте Проспекта эмиссии слова «Уполномоченный брокер» заменить на слово «профучастник».

9. Остальные пункты Проспекта эмиссии остаются неизменными.

Директор ЗАО «Универсам «Центральный» А. А. Застенский

Директор ООО «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

Поручитель:

Директор ОДО «НП-Сервис» Д. Б. Борисенок

УНП 100080849

# ПРЫМАЦЬ НЕ БУДУЦЬ

**Зварот у рэдакцыю атрымала газета «Свабоднае слова» Рагачоўскага раёна. Жыхары Турска скардзяцца, што ў іх не прымаюць сабраныя чырвоныя парэчкі.**

Асаблівых праблем з чорнай парэчкай не было, яе і Рагачоўскае раённае спажывецкае таварыства прымала, і прыватнікі. А вось чырвоныя ягады сталіся незапатрабаванымі. Як адзначылі ў прыёмнай Рагачоўскага філіяла Гомельскага вінаробнага завода, іх дзверы для ўсіх мясцовых дароў лета ўжо зачынены. «Мы ведаем пра праблему, папярэдне дамовіліся аб разавых пастаўках на перапрацоўчыя прадпрыемствы Мінскай вобласці, — пракаментавала сітуацыю **вядучы таваразнавец Рагачоўскага раённага спажыўтаварыства Іна ШЫМКОВІЧ.** — Ураджай сёлета выдатны, у заводаў прапаноў вельмі шмат. Цэны падаюць імкліва, заводы хочуць браць ягаду па 26—50 капеек. Прымаць іх даражэй — для нас гэта вялікія страты».

У Рагачоўскім раёне ўсяго было нарыхтавана 87 тон чырвонай і чорнай парэчкі. З іх 66 тон прыняў Гомельскі вінаробны завод. Аднак ёмістасці арганізацыі абмежаваныя, таму пастаўкі завяршыліся 10 ліпеня. 21 тону мясцовае райспажыўтаварыства накіравала ў Мядзельскі раён Мінскай вобласці, але і там спынілі прыёмку.

# ЮНАЯ МОТАЗОРКА

**Яму толькі 13, а ён ужо прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў па мотакросе і ўваходзіць у першую пяцёрку агульнага заліку ў краіне ў сваім класе. Стас Равяка — гонар і пакуль адзіная надзея не толькі мазырскага, але і гомельскага мотакросу. З ім паразмаўляў карэспандэнт газеты «Жыццё Палесся».**



Фота http://www.mazyr.by/

Першы матацыкл Стасу купіў бацька, калі хлопчыку было ўсяго толькі чатыры гады. Юнак успамінае — гэта быў танны кітайскі байк з рухавіком ад бензапілы, заводзіўся як газонакасілка. Стас кажа, што ўсё пачыналася як звычайная забава. Спярша яму спадабалася катацца на матацыкле з татам, а затым ужо і сам спасцігаў першыя азы кіравання. Цяпер ён упэўнена ўтаймоўвае аўстрыйскага двухколавага сябра з аб'ёмам рухавіка 85 куб. см.

Галоўным трэнерам Стаса заўсёды быў тата. Ён побач і на трэніровачнай трасе, і на ўсіх спаборніцтвах. Займаецца юнак каля свайго роднага Мазыра, а калі быць дакладным, то ў Козенках, дзе непадалёку ёсць трэніровачная траса. Праўда, яшчэ некалькі гадоў таму яна была ў запушчаным выглядзе, пакуль бацька юнака спартсмена не заняўся ёю самастойна.

«Трэба больш працаваць над праходжаннем паваротаў, бо там у мяне здараюцца вялікія страты часу. А вось з трамплінамі ўсё добра. Буду больш трэніравацца, і з часам усё атрымаецца», — кажа юны спартсмен.

КАРЭСПАНДЭНТ ВЫСВЯТЛЯЎ СІТУАЦЫЮ

# КАМУНАЛЬНАЯ АБЫЯКАВАСЦЬ,

## або Чым незадаволеныя вясковыя арандатары жылля?

**Карэспандэнт «Звязды» пабываў у вёсцы Пугляі Аршанскага раёна, дзе жыхары арэндных кватэр расказалі пра шматлікія камунальныя праблемы. Іх раней было значна больш, пакуль не ўмяшаліся супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці. Дарэчы, прыйшлося ім гэта рабіць некалькі разоў.**

### Вада па чарзе

Ёсць турысты, якія любяць ездзіць у экстрэмальныя вандроўкі. Напрыклад, на тэрыторыю «мёртвага горада» Прыпяць каля Чарнобыльскай АЭС. Але ж там людзі не жывуць. А вось у Пугляях — жывуць! Калі б арганізаваць экскурсію туды, безумоўна, у аматараў экстрыму ўражанняў было б багата.

Усяго ў вёсцы пяць дамоў, узведзеных у 1960—1970-х гадах. Два стаяць без жыльцоў. Дарэчы, як падлічылі ў дзяржкантролі, ва ўсіх дамах 69 кватэр, 44 з якіх пустыя, заселеныя толькі 25.

— У красавіку вывучалі стан дзяржаўнага жыллёвага фонду. Заехалі сюды. Кватэры без жыльцоў знаходзіліся ў непрыдатным для пражывання стане. У прыватнасці, частка вокнаў была закладзена цэглай, зацягнута плёнкай, не было элементаў некаторых рам, перагародак сцен. Убачылі таксама, што падлог няма, як і дзвярэй, пячэй, электраправодкі. Дзе ўсё гэта? Пытанне, адказу на якое пакуль што няма, — расказаў **Сяргей ЛІСЯНКОЎ, супрацоўнік кантрольнага ведамства.**

Падчас маніторынгу высветлілася, што ў жылым доме № 5 па завулку Школьным не працавалі водаправод і каналізацыя. Пры гэтым не было надворных прыбіральняў.

Кантралёры праверылі, як працуюць каля дамоў дзве водазаборныя калонкі. З іх падавалася вада з дадаткам іржы.

У доме № 1 па завулку Школьным, дзе таксама жывуць людзі, водаправод і каналізацыя на момант праверкі дзейнічалі. Аднак падача вады ў сувязі з адсутнасцю неабходнага ціску была, мякка кажучы, нестабільнай. І жыхары карысталіся вадой па чарзе! Каналізацыю даўно прарвала. І з-за гэтага з дома № 1 бруд выцякаў амаль што на прыдамавую тэрыторыю.

### Перакрылі дах і... забылі?

Дзіўна, але факт. Замест таго каб жыллё прывесці ў парадак, камунальнікі пайшлі іншым шляхам.



У вёсцы Пугляі.

Восенню пазамінулага года ўнітарным прадпрыемствам «Оршакамгас» быў праведзены капітальны рамонт дома № 1. А дакладней — даху, плюс у пустых кватэрах усталявалі пластыкавыя шклопакеты і металічныя ўваходныя дзверы. Але ў саміх кватэрах за рамонт не браліся.

Вяскоўцы здзіўляюцца, чаму ў пустых кватэрах замянілі вокны, дзверы, а ў жылых — не.

— Мэтазгоднасць праведзеных работ выклікае сумнеў, бо для паляпшэння жыллёвых умоў грамадзян нічога не зроблена, — адзначылі ў ведамстве.

Мяне, напрыклад, здзівіла, што ў кватэрах, дзе жывуць людзі, па-ранейшаму, пячное ацяпленне, прывазны газ у балонах, няма гарачага водазабеспячэння. Напэўна, трэба было падчас рамонту палепшыць умовы пражывання? Ці не так?

А што кажуць людзі? Жыхары з дома № 1 паскардзіліся на згаданы вышэй рамонт даху. З-за гэтага, як яны сцвярджаюць, заліло столі. Звярталіся на «прамую лінію» ў абласную газету. І здзівіліся, калі прачыталі каментарый адказнай асобы ЖКГ, што самі вінаватыя, бо нешта падчас рамонту ў сваім жыллі няправільна зрабілі.

**Жыхарка Валянціна СТАБРОЎСКАЯ** падчас нашай размовы зазначыла, што не магла адбяліць столь і сцены пасля патопу. І таму ўзяла крэдыт (6 мільёнаў рублёў «старымі»), каб нацягнуць столь. Яна ж паказала «жыроўку»: у месяц за арэнду кватэры плошчай 48,6 метра плацiць больш за 19 рублёў. Усяго з камунальнымі паслугамі каля 32 рублёў.

Яна і іншыя жыхары казалі пра тое, што апынуліся заложнікамі сітуацыі. У свой час жыллё не прыватызавалі, дык і па законе давалі пісьмовую згоду на пражыванне ў кватэры на правах арэнды. Па логіцы ўсё правільна. Але ж, калі жыллё арэнднае — значыць, дзяржаўнае, дык чаму адказная арганізацыя не клапоціцца пра тое, каб кватэры былі прыдатнымі для камфортнага пражывання?

**Старэйшына вёскі Пугляі, дэпутат Барздоўскага сельскага Савета Таццяна ЦІКАР** як магла супакойвала землякоў, якія выйшлі на сустрэчу, а таксама падзякавала дзяржкантролю за ўмяшанне ў сітуацыю.

Сяргей Лісянкоў канстатаваў, што камунальнікі многае выправілі. А раней даходзіла да абсурду. Напрыклад, паставілі прыбіральню. Але ўпапатку забылі пра тое, што неабходна зрабіць адтуліны для вентыляцыі. Ды і чаму на шляху да прыбіральні не скасілі траву? А як дайсці да «дамка», калі няма святла?

Суразмоўнік расказаў пра раўнадушша ў рабоце не толькі супрацоўнікаў ЖКГ. Пасля таго як Камітэт дзяржкантролю даў даручэнні выправіць хібы, фармалізм быў праяўлены з боку тых, хто адказвае за здароўе вяскоўцаў.

— Напрыклад, у адказе з Віцебскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі паведамілі, што з водаправодам і каналізацыяй дома № 1 усё ў парадку. А насамрэч спецыялісты Аршанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі не заўважылі разліву фекальнай каналізацыі, нездавальняючай якасці вады. У доме № 5, на іх думку, наогул адсутнічалі водаправод і каналізацыя, — удакладніў суразмоўнік.

Спатрэбілася яшчэ адно ўмяшанне абласнога Камітэта з выездам на месца. І чарговы раз выявілі наяўныя недахопы. Пасля гэтага працэс пайшоў хутчэй. Што зрабілі? Пачысцілі воданапорную вежу артэзіянскай свідравіны. У выніку якасць вады палепшылася і «напор» стаў больш моцны. Таксама замянілі водаправодныя трубы да дома № 5. Акрамя гэтага, пачалі рамонт пустуючых кватэр у доме № 1. Ліквідаваныя іншыя недахопы.

— Складваецца непрыбавная сітуацыя, калі людзей з-за нядбайнасці і абыякавасці асобных службовых асоб кінулі адных вырашаць свае жыллёвыя праблемы. І гэты пры тым, што яны пражываюць у дзяржаўным жыллі, — канстатавалі па выніках маніторынгу ў дзяржкантролі.

Па прапанове Камітэта некалькі службовых асоб і спецыялістаў УП «Оршакамгас», Аршанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, якія праводзілі абследаванне, прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці. Пытанні заканчэння рамонту і паляпшэння ўмоў пражывання грамадзян знаходзяцца на кантролі. «МС» таксама будзе сачыць за вырашэннем людскіх бедаў. Аб чым мы пазней і паведамім.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### КАМЕНТАРЫЙ ДА ТЭМЫ

**Старшыня Аршанскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль СІЛЬЧАНКА** расказаў, што мясцовая ўлада ў курсе сітуацыі. У сельскім выканкаме новы старшыня.

— Агучаныя пытанні, якія хвалююць вяскоўцаў, разгледзім. І па меры магчымасцей тое, што можна будзе зрабіць, зробім, — адзначыў ён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 19 ліпеня 2018 года.